
Ніва

 БЕЛАРУСКІ ТЫДНЁВІК 

№ 47 (926) ГОД XVIII БЕЛАСТОК 25 ЛІСТАПАДА 1973 г. ЦАНА 60 гр.

З ВОПЫТУ НАЧАЛЬНІКА ГМІНЫ

Ужо ведаем: калі распачнуць дзейнасць новавыбраныя **мясцовыя** рады, дзяржаўнай **адміністрацыяй** у паветах кіраваць будуць **начальнікі паветаў**, а ў ваяводствах — **ваяводы.**

Гэта далейшае паслядоўнае развіццё адміністрацыйнай рэформы, ажыццяўленне якой пачалося ад утварэння гмін і ўстанаўлення гмінных начальнікаў. Вопыт у іх дзейнасці з'яўляецца цяпер багатай крыніцай ведаў для адміністрацыйных пераўтварэнняў на вышэйшым узроўні. Які гэта вопыт? Што з яго вынікае?

Адказу на гэтыя пытанні, шукаў я ў Гайнаўскім павеце.

Намеснік старшыні прэзідыума ПРН у Гайнаўцы, інжынер Вацлаў Цэглярскі, адказны за сельскую гаспадарку, сказаў мне:

— Нам цяпер непараўнальна лягчэй арганізоўваць сельскагаспадарчую вытворчасць. Доказ гэтаму — жніво на Гайнаўшчыне закончылі мы сёлета на 21 дзень раней, чым у мінулым годзе.

Сакратар па сельскагаспадарчых справах павятовага камітэта партыі, тав. Рышард Дваракоўскі сцвердзіў:

Амаль гадавы вопыт у дзейнасці начальнікаў гмін поўнасцю апраўдаў нашы надзеі. Гмінныя праўленні сталі добрымі арганізатарамі гаспадарчага і грамадскага жыцця сваёй тэрыторыі.

— Гайнаўскі павет падзелены цяпер на восем гмін. Каго з іх начальнікаў перш за ўсё варта наведаць?

— Нялёгка так адразу раздзяляць заслугі і засцярогі, — гаворыць сакратар Дваракоўскі. — У кожнага з начальнікаў гмін знайшлося б адно і другое. Аднак раіў бы вам паехаць у Дубічы Царкоўныя — да Чыквіна. Ён раней быў старшынёю тамашняга прэзідыума ГРН і па нашай рэкамендацыі надалей кіруе новай Дубіцкай гмінай, якая цяпер — адна з лепшых у нашым павеце.

Гэту апінію пацвердзіў таксама першы сакратар павятовага камітэта партыі ў Гайнаўцы тав. Людвік Бартосяк. Дык накіраваўся я ў Дубічы Царкоўныя. У апошніх гадах вёска шматзначна змяніла свой воблік. Паявіліся новыя, пераважна мураваныя дамы (на здымку), добра ўпарадкаваная вуліца. Сапраўды, відаць тут рука карпатлівага гаспадара. Дубічы завявалі першае месца па рэалізацыі грамадскіх абавязацельстваў у гонар 25-годдзя ПНР, за што атрымалі двухсоттысячную ўзнагароду, якую насельніцтва прызначыла на аднаўленне выгляду вёскі і на рамонт святліцы, дзе неўзабаве размесціцца вясковы клуб.

На тэрыторыі Дубіцкай гміны знаходзіцца зараз 27 вёсак, аб'яднаных у 17 салэцтваў, у якіх жыве звыш тысячы гаспадароў.

— Ці цяжка быць начальнікам гміны? — пытаю тав. Чыквіна.

— Ці цяжка? — задумаўся начальнік. — А вам цяжка быць журналістам?

— Неяк спраўляюся...

— Я таксама.

Мы паглядзелі адзін на другога і абодва рассмяяліся. А пасля, ужо за кавай, якую падрыхтавала прыгожая бухгалтарша Зінка, пайшла ў нас гутарка пра начальніцкі вопыт.

— Самым істотным у працы начальніка гміны, — гаварыў таварыш Чыквін, — я лічу тое, што цяпер не мушу кожнай дробязззю заварочваць галаву павятоваму начальству. Начальнік гміны можа і павінен кіраваць супрацоўніцтвам такіх устаноў, як ГС, міжгурткоўскія машынна-трактарныя базы, сельскагаспадарчыя гурткі, спулдзельчы банк і іншыя.

— І што ў вас атрымалася ад гэтага кіравання?

— А вось што, паслухайце: перад жнівом мы супольна з грамадскім і партыйным актывам склалі дакладны план выкарыстання жніўнай тэхнікі і рашуча патрабавалі поўнай рэалізацыі гэтага плана. Дзякуючы гэтаму мы хутчэй справіліся са жнівом і абмалотамі, а ГС прыняў больш збожжа непасрэдна з панадворкаў гаспадароў.

Ведаем, колькі клопату дастаўляла сялянам нарыхтоўка будаўнічых матэрыялаў. Цяпер будаўнічымі справамі ў гміне займаецца адпаведна падрыхтаваны чалавек. Мы рашылі пайсці яшчэ далей. **Дагаварыліся** з ГС-ам, каб яны, замест дастаўляць матэрыялы з вагонаў у свае склады, адразу ўласным транспартам адвозілі іх у вёскі — па спіску, падрыхтаваным нашым гмінным праўленнем. Кошт транспарту ў гэтым выпадку або нязначна, або зусім не павышаецца, але ашчаднасць часу для гаспадароў вялікая. Такім чынам набылі цэглу, цэмент, сіпарэкс і пустакі жыхары Дубічаў Царкоўных: Сяргей Тарасюк, Пятро Стэпанюк, Мікалай Стара-

(Працяг на стар. 4)



Васількаў (Беластоцкі павет). *Фота Я. Цялушэцкага.*

БГКТ ХРОНІКА

■ У гуртках БГКТ на Гайнаўшчыне адбываюцца справаздачныя, а дзе трэба, і справаздачна-выбарныя сходы. Нядаўна адбыўся справаздачна-выбарны сход гуртка БГКТ у Гародчыне. У склад новага праўлення гуртка ўвайшлі: Валянціна Ціханюк (старшыня), Рыгор Сельвяструк, Марыя Антасюк і Валя Леўчук. На сходзе 8 чалавек падпісалі членскія дэкларацыі БГКТ і былі прыняты ў рады Беларускага грамадска-культурнага таварыства. Па ініцыятыве новага праўлення гуртка БГКТ на гэтым жа сходзе прысутныя пастанавілі ўтварыць гурток таварыства польска-савецкай дружбы. Усе члены БГКТ выразілі жаданне быць членамі ТППР і пастанавілі, што члены праўлення гуртка БГКТ будуць таксама членамі праўлення гуртка ТППР.

■ Па ініцыятыве праўлення гуртка БГКТ у Збучы таксама ўтвораны гурток ТППР-у, членамі яго з'яўляюцца ўсе члены БГКТ, а старшынёй выбраны старшыня гуртка БГКТ Канстанцін Лаўрэшук.

■ У канцы кастрычніка члены гуртка БГКТ у **Доўгім** Бродзе на сваім справаздачна-выбарным сходзе падсумавалі ранейшую дзейнасць гуртка і намецілі далейшыя напрамкі яго працы. Новае праўленне гуртка БГКТ складаецца з наступных асоб: Яўгень Хмара — старшыня, Міраслаў Вапа — сакратар і Зінаіда Хмара — скарбнік. На гэтым жа сходзе ў рады БГКТ было прынята дзесяць новых членаў.

■ Нядаўна адбыўся таксама справаздачна-выбарны сход гуртка БГКТ у Дубічах Царкоўных. Пасля абмяркоўкі справаздачнага даклада і далейшых напрамкаў дзейнасці, было выбрана новае праўленне гуртка, у склад якога ўвайшлі: Лідзія Герасімюк — старшыня, Яўгенія Хіліманюк — сакратар і Ніна Петручук — скарбнік.

■ 6 кастрычніка беларускі калектыў песні і танца „Белавежа" з гайнаўскага аддзела БГКТ выступіў з канцэртам у доме культуры „Гурнік" на павятовай акадэміі ў Гайнаўцы, прысвечанай 56 гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

■ Харавы калектыў бельскага аддзела БГКТ 6 кастрычніка таксама даў канцэрт на павятовай акадэміі з нагоды гадавіны Вялікага Кастрычніка.


■ **На пасяджэнні** прэзідыума бельскага аддзела БГКТ (адбылося 10.XI.) абмяркоўваліся арганізацыйныя справы, звязаныя з песенным конкурсам, а таксама справы з адбываючайся справаздачнай кампаніі ў гуртках БГКТ Бельшчыны.

■ Пад кіраўніцтвам Івана Шыманюка ў Семяноўцы працаваў мастацкі калектыў гуртка БГКТ. У апошні час аслабла яго дзейнасць, паколькі Іван Шыманюк выбыў з вёскі на вайсковую службу. Нядаўна ён вярнуўся з арміі і пачаў працаваць над тым, каб мастацкі калектыў Семяноўкі зноў шырока разгарнуў культурна-асветную працу. (мх)

ПРАЗ ТЫДЗЕНЬ У "НІВЕ"

СУСТРЭЧЫ З ЗЕМЛЯКАМІ

ТРАДЫЦЫЙНЫ МЕТАД ТАКОЙ РОЗНІЦЫ НЕ ВЫЛАЎЛІВАЕ...



— У вітрынах навуковых кнігарняў, — звяртаюся да дац. др габ. Ігара Цімафеюка, навуковага супрацоўніка Інстытута эканамічных навук Варшаўскага універсітэта, — стаяць побач дзве Вашы кніжкі: другое, дапоўненае выданне працы, аснаванай на доктарскай дысертацыі[1]) і габілітацыйная дысертацыя[2]). 13 верасня Вы выступалі па тэлебачанню, а 16 кастрычніка па радыё і гаварылі аб істотных праблемах нацыянальнага даходу. Ці не захацелі б сказаць Вы і нашым чытачам некалькі слоў пра сваё жыццё і працу? Усё ж Вы, сын селяніна, заўсёды займаліся не толькі прафесійнай, але таксама і грамадскай працай, а ўжо ў 35 год атрымалі навуковую ступень габілітаванага доктара.

(Працяг на стар. 4)

Вялікая зала святліцы фабрыкі прылад і ўхвытаў у Беластоку запоўнена па апошняе месца. Сюды прыйшлі прадстаўнікі завадскога калектыву ФПіУ, а таксама прадстаўнікі 18 іншых фабрык, прадпрыемстваў і ўстаноў.

За ганаровым сталом месца займае кандыдат у радныя ВРН, член ЦК, I сакратар ВК ПАРП **Здзіслаў Куроўскі**, кандыдаты ў радныя МРН: член экзекутывы ВК ПАРП, I сакратар ГК ПАРП — **Рамуальд Жукоўскі**, член экзекутывы ГК ПАРП старшыня прэзідыума МРН — **Аляксандр Чуж**, прадстаўніца фабрыкі імя Сяржана, а таксама кандыдаты ў радныя ад калектыву „Ухвытаў": **Мікалай Харкевіч**, **Анна Чаркоўская**, **Яўген Корсак** і **Казімір Жынэль**.

Пачынаецца першая ў ваяводстве сустрэча з кандыдатамі ў радныя ваяводскай і гарадской рады нарадовай. На франтовай сцяне святліцы стылізаваны арол, сімвал дзяржаўнага герба, а на ім надпіс: „Праграма I Краёвай канферэнцыі ПАРП — наша праграма". Гэта лозунг сустрэчы, лозунг выбарнай кампаніі.



Невыпадкова сустрэча адбывалася іменна ва „Ухвытах". Калектыў гэтай фабрыкі абавязаўся даць у гэтым годзе дадатковую прадукцыю, вартасць якой 2,8 мільёна зл. Калі адбывалася сустрэча, прадстаўнікі фабрыкі далажылі, што ўжо выканана дадатковай прадукцыі на 2,6 мільёнаў зл. Шмат, бо больш 2 тыс. гадзін рабочыя працавалі грамадскім чынам пры разбудове фабрыкі. Гэта толькі некаторыя прыклады добрай працы самаахвярнага калектыву. Вырабы беластоцкіх „Ухвытаў" — гэта добрая марка. Знаюць пра гэта не толькі ў краіне, але і за яе межамі. Фабрыка экспартуе свае вырабы ў многія краіны свету, а найбольш — у Савецкі Саюз.

Слова бярэ Здзіслаў Куроўскі, кандыдат у радныя ВРН з горада Беластока.

— Усебаковае, хуткае развіццё нашай краіны, павялічваючаяся яе гаспадарнасць, эканамічная сіла і міжнародны аўтарытэт — гэта прычына для задавальнення ўсіх палякаў, — гаварыў тав. З. Куроўскі. Але права да асаблівага задавальнення маюць тыя, хто добра працуе, хто з'яўляецца наватарам і ініцыятарам дзеяння, хто прысціяшае развіццё і багацце нашай краіны. Тыя, якіх мы называем людзьмі добрай работы.



Выступае I сакратар ВК ПАРП З. Куроўскі.

Высока ацэнен факт, што добрыя вынікі ў галіне сельскай гаспадаркі і прамысловасці спрыялі ўмацаванню сярод насельніцтва Беластоцкага рэгіёна веры ў свае сілы, адвагі думкі і дзеяння, ўмацаванню пераканання, што можам зрабіць больш. Вымоўным прыкладам вышэй сказанага з'яўляецца 40-працэнтнае павелічэнне вартасці прамысловай прадукцыі і 27-працэнтнае павелічэнне валавой сельскагаспадарчай прадукцыі на працягу апошніх трох год.

— Пераходзячы на вышэйшы этап развіцця нашай гаспадаркі, — гаварыў тав. З. Куроўскі, — мы павінны вызваляцца ад дрэнных прывычак і кепскіх практык, якіх нельга пагадзіць з сучаснай, інтэнсіўнай, добра арганізаванай гаспадаркай. Давайце прызадумаемся разам. што мы павінны зрабіць, каб шэраг дробных спраў, якія нас нервуюць, псуюць добры настрой і самаадчуванне, можна было хутчэй выкінуць з нашага жыцця, а адначасова ўсе каштоўныя прапановы і ініцыятывы, якія павялічваюць эфектыўнасць працы і павышаюць узровень гаспадарнасці, маглі быць хутчэй і без непатрэбных перашкод ўведзены ў практыку. Імкненнем ВК партыі, а таксама ВК Фронту адзінства народу з'яўляецца тое, каб сучасная выбарная кампанія ў рады нарадовыя перарадзілася ў агульнаграмадскія дэбаты, мэта якіх — павялічыць эфектыўнасць гаспадарання, удасканаліць формы і метады загадвання, знаходзіць новыя рэзервы і ўказваць такія магчымасці.

Звяртаюся да насельніцтва Беласточчыны з заклікам прымаць шырокі ўдзел у пошуках новых рэзерваў, шляхоў і спосабаў, вядучых да павелічэння эфектыўнасці нашай гаспадаркі. Думаю, што пры дапамозе „Газеты Беластоцкай", радыёвяшчальнай станцыі можна будзе сабраць шэраг каштоўных ініцыятыў у банк добрых думак, які праводзіўся б пад лозунгам „ Можна лепш". Найцікавейшыя прапановы, вырашэнні і вопыт будуць публікавацца, распаўсюджвацца, а іх аўтары атрымаюць за гэта адпаведную сатысфакцыю.

Тав З. Куроўскі сказаў, што ёсць апрацаваны перспектыўны план развіцця нашага ваяводства, сягаючы 1990 года. Многа месца ў прамове прысвечана інвестыцыям, якія ў бліжэйшы час будуць праводзіцца на Беласточчыне. Ужо сёння падрыхтавана разбудова камбіната „Понарбяль" (ФПіУ), фабрыкі імя Сяржана. Разбудоўваюцца і мадэрнізуюцца фабрыкі ў Фастах, Васількове, Гарадку, Ломжы і Замброве. Шырокая мадэрнізацыя і разбудова праводзіцца на металазаводзе ў Чорнай Беластоцкай, КЗКС у Старасельцах, ЗНТК у Лапах і беластоцкай „Тэльзе". У Беластоку будуецца фабрыка ўпаковак, разбудоўваецца электрацяплоўня, ідзе падрыхтоўка да будовы ў Беластоку вялікай фабрыкі мэблі.

— Маем добрую і амбітную праграму, — сказаў на заканчэнне I сакратар ВК ПАРП. Ідзем з ёю да выбаршчыкаў, а яе рэалізацыя залежыць ад нас усіх. Няхай жа выбарная кампанія станецца перыядам актыўных пошукаў, як можна лепш працаваць, спраўней афармляць усе справы, якія знаходзяцца ў нашых руках.

Пасля выступлення тав. З. Куроўскага адбылася цікавая, жывая дыскусія.

Тэкст і фота **А. Карпюка**

З краіны

Візіт партыйна-ўрадавай дэлегацыі БНР

Па запрашэнню ЦК ПАРП, Рады Дзяржавы і ўрада ПНР Польшчу наведала партыйна-ўрадавая дэлегацыя Балгарскай Народнай Рэспублікі пад кіраўніцтвам I сакратара ЦК Балгарскай камуністычнай партыі, старшыні Рады Дзяржавы БНР Тодара Жыўкава.

Сустракалі гасцей Э. Герэк, Г. Яблонскі, П. Ярашэвіч. Праехаўшы вуліцамі Варшавы, госці зладжылі вянок на магіле Нязнанага Салдата, а потым адбылася сустрэча з польскім партыйным і дзяржаўным кіраўніцтвам. Вечарам Э. Герэк даў абед у чэсць высокага госця.

На другі дзень госці знаёміліся з Варшавай — былі на месцы будовы Лазенкоўскай трасы, у новым жыллёвым квартале Брудна, на фабрыцы Сверчэўскага, дзе сустрэліся з рабочымі.

У сераду балгарскія госці былі ў Велькапольшчы. Наведалі металургічны камбінат „Г. Цагельскі" ў Познані, прынялі ўдзел у сустрэчы з рабочымі.

На наступны дзень адбыўся вялікі мітынг дружбы ў кангрэсавай зале Палаца культуры і навукі ў Варшаве. На мітынгу выступілі Э. Герэк і Т. Жыўкаў.

16 лістапада візіт балгарскіх гасцей закончыўся. Урачыстае развітанне адбылося на аэрадроме „Акэнцэ". Прысутнічалі найвышэйшыя партыйныя і дзяржаўныя ўлады на чале з Э. Геркам. (вл)

З БССР

Ордэн Дружбы для Беларусі

Ад 11 па 14 лістапада гэтага года прабываў у Беларусі член Палітбюро ЦК КПСС, Старшыня Савета Міністраў СССР Аляксей Касыгін. Ён наведаў некаторыя прамысловыя прадпрыемствы ў Оршы, Магілёве і Мінску, пабываў на выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі, зрабіў паездку да мемарыяльнага комплексу „Хатынь" і Кургана Славы, дзе ўсклаў вянкі. 14 лістапада А. Касыгін прыняў удзел у рэспубліканскім сходзе партыйна-гаспадарчага актыву, у час якога ўручыў Савецкай Беларусі Чырвоны сцяг ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ, якім Беларусь узнагароджана за поспехі ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве за павелічэнне вытворчасці і нарыхтовак прадуктаў жывёлагадоўлі ў зімовы перыяд 1972/73 гадоў.

14 лістапада адбылося сумеснае ўрачыстае пасяджэнне Цэнтральнага Камітэта КПБ і Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, прысвечанае ўручэнню рэспубліцы ордэна Дружбы народаў. У пасяджэнні прыняў удзел таксама Аляксей Касыгін. Выступаючы з прамовай, ён між іншым адзначыў: „Беларускі народ карыстаецца вялікай павагай сваіх братоў — народаў Савецкага Саюза..." За высокую ўзнагароду падзякаваў I сакратар ЦК КПБ, тав. П. Машэраў. (вр)



Niedziela 25.XI.

7.20 Program dnia. 7.25 TV Kurs Rolniczy. 8.00 „Przypominamy, radzimy". 8.10 „Alarm przeciwpożarowy trwa". 8.20 „Nowoczesność w domu i zagrodzie". 8.45 „Bieg po zdrowie". 9.00 TELERANEK. 10.15 „Saquaro" — film dok. ang. („Świat, który nie może zaginąć"). 10.40 „Antena". 10.55 „Aurum — Detronizacja?" — film dok. cz. II. 11.45 VII Krynicki Festiwal Arii i Pieśni im. Jana Kiepury. 12.15 Dziennik. 12.30 „Przemiany". 13.00 Dla dzieci: J. Żylińska — „Legenda o Liczyrzepie". 14.00 „Piosenka dla Ciebie". 14.50 „Radar". 15.00 „Wielka gra". 15.50 „Wspomnienia z lata" — pr. muz. 16.35 Losowanie Totolotka. 16.50 „Tele-Echo". 17.45 „Kryteria". 18.00 Sportowy magazyn sprawozdawczy. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 „Ostatni szturm" — film fab. radz. („Wyzwolenie") cz V. 21.25 Magazyn sportowy. 21.55 „Berlin zaprasza" (Międzynarodowa Wiosna Estradowa 73).

Poniedziałek 26.XI.

12.45 TV Technikum Rolnicze: Matematyka. 13.25 TV Technikum Rolnicze: Uprawa roślin. 16.15 Program dnia. 16.20 Telereklama. 16.30 Dziennik. 16.40 „Zwierzyniec". 17.30 „Echo stadionu". 17.55 TV Kurier Olsztyński. 18.10 „Oferty". 18.25 Kronika Warszawy i Mazowsza. 18.45 „Eureka". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 Teatr TV: M. Gorki: — „Ostatni". 21.45 „Sezam". 22.20 Dziennik. 22.30 Utwory kameralne kompozytorów radzieckich.

Wtorek 27.XI.

10.00 „Noc błazna" — film franc. („Pani de Monsoreau") odc. III. 11.05 Dla szkół: (kl. III lic.) Język polski — M. Gorki — „Na dnie". 15.20 TV Technikum Rolnicze: Matematyka. 15.55 TV Technikum Rolnicze: Uprawa roślin. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Rodzina Durtolów" — film franc. odc. XI. 17.05 Program publicystyczny. 17.35 Telereklama. 17.40 Dla młodzieży: „Trzymamy straż nad Odrą" — rep. film. 18.05 Gra Orkiestra TV Katowice. 18.25 Kronika Warszawy i Mazowsza. 18.45 „Warszawskie perspektywy" — program publ. 19.10 „Przypominamy, radzimy". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 „Noc błazna" — film franc. („Pani de Monsoreau") odc. III. 21.10 „Interstudio". 21.50 „Artyści, których podziwiamy" — Halina Mickiewiczówna. 22.35 Dziennik. 22.50 Wiadomości sportowe.

Środa 28.XI.

8.45 „Jaskółki" — film fab. węg. 10.00 Dla szkół: (kl. VII) Fizyka — „Zasady dynamiki". 11.05 Dla szkół: (kl. VII—VIII) Wychowanie plastyczne — „Rzeźba". 12.00 Dla szkół: (kl. VIII) Chemia — „Węglowodany". 12.45 TV Technikum Rolnicze: Fizyka. 13.25 TV Technikum Rolnicze: Botanika. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Dla młodych widzów: „Harcerski raport". 17.10 Dla dzieci: „Dźwięki i czary". 17.40 „Informacje, Towary, Propozycje". 17.55 „Spacerkiem po kinach". 18.25 Kronika Warszawy i Mazowsza. 18.45 Magazyn Postępu Technicznego. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 „Jaskółki" — film fab. węg. 21.30 „Biała lokomotywa" — rep. film. 21.50 „Show 21 3456/B" — autorski program rozrywkowy Zdzisława Leśniaka. 22.50 Dziennik. 23.05 Wiadomości sportowe.

Czwartek 29.XI.

10.00 „Prawda" — film fab. franc. 13.30 TV Kurs Informatyki: Zasady programowania komputerów (II). 14.00 Matematyka w szkole. 15.10 TV Technikum Rolnicze: Fizyka. 15.45 TV Technikum Rolnicze: Botanika. 16.15 Program dnia. 16.20 PKF. 16.30 Dziennik. 16.40 „Ekran z bratkiem". 17.45 „O tańcu polskim czyli tak przezwanym polonezie" („Chata pełna muzyki"). 18.20 Telereklama 18.25 Kronika Warszawy i Mazowsza. 18.45 „Mazowsze dziś i jutro" — program publ. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 „Prawda" — film fab. franc. 22.20 Dziennik. 22.35 „Gratulujemy" — program rozr. 23.25 Wiadomości sportowe.

Piątek 30.XI.


10.00 „Ostatni szturm" — film fab. radz. („Wyzwolenie") cz. V. 12.00 Dla szkół: (kl. VIII i I lic.) Przysposobienie obronne. 12.45 TV Technikum Rolnicze: Język polski. 13.25 TV Technikum Rolnicze: Chemia. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Pora na Telesfora". 17.25 „Nie tylko dla pań". 17.45 Telereklama. 17.50 Dla młodzieży: Tygodnik Informacyjny Młodych. „Dwie szkoły" — telekonkurs. 18.25 Kronika Warszawy i Mazowsza. 18.45 „Konsylium" cz. I. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 Śpiewa Mieczysław Mierzejewski. 20.50 „Panorama". 21.30 Teatr TV: A. Salacrou — „Ruch jednokierunkowy". 22.30 „Konsylium" cz. II. 22.45 „Informacje, Towary, Propozycje". 23.00 Dziennik. 23.15 Wiadomości sportowe.

Sobota 1.XII.

8.35 „Czego się nie robi, żeby dostać spadek" — film fab. ang. 10.00 Dla szkół: (kl. VII) Zoologia — „Pasożyty". 11.05 Dla szkół: (kl. VIII) Geografia — „Gospodarcze oblicze Kanady". 14.20 TV Technikum Rolnicze: Język polski. 14.55 TV Technikum Rolnicze: Chemia. 15.25 Program dnia. 15.30 Program I proponuje. 15.50 Redakcja Szkolna zapowiada. 16.05 TV Informator Wydawniczy. 16.30 Dziennik. 16.40 Dla młodzieży: A. De Saint Exupêry — „Mały Książę". 17.25 „Z kamerą wśród zwierząt". 17.55 „Wychowanie fizyczne receptą na zdrowie". 18.20 „Kwadrans akademicki". 18.35 „Pegaz". 19.20 Dobranoc. 19.30 Monitor. 20.15 „Dla górników — W rytmie na 3/4". 21.25 „Czego się nie robi, żeby dostać spadek" — film fab. ang. 22.50 Dziennik. 23.05 Wiadomości sportowe. 23.15 „Ballady Franciszka Villona".

Мой родны кут, як ты мне мілы!..
Забыць цябе не маю сілы!
Не раз, утомлены дарогай,
Жыццём вясны мае убогай,
К табе я ў думках залятаю
І там душою спачываю.

Якуб Колас




З Мацейкавай Гары прасціраецца абшырны краявід на маляўнічую даліну Нарвы і Рудніка.

КРАЯЗНАЎЧЫ СЛОЎНІК

Аднога

Аднога — вёсачка і солтыства, у якую ўваходзяць мясцовасці: Сахаркі, Пудлес (Дзянісава), Сакі, Аднога, Круглы Лясок, Полька, Мацейкава Гара. На правым крутым беразе р. Нарвы знаходзіцца Мацейкава Гара, а іншыя мясцовасці раскіданы сярод маляўнічых пералескаў воддаль ракі. Гаспадарак каля 65, жыхароў — прыблізна 250 чалавек. Знаходзіцца ў гміне Міхалова Беластоцкага павету.



Старадаўнія вароты ў Аднозе дажываюць свой век.

Кожная з гэтых назваў тоіць у сабе доўгую гісторыю людской дзейнасці, а некаторыя спавіты займальнымі легендамі. Праўдападобна, да „Дзянісава“ адносіцца запіс у „Люстрацыі“ каралеўскіх маёмасцей ваяводства Падляшскага, складзенай у 1576 годзе: „У Ляшчынскага Міска на Дзянісавым Востраве маргоў 4“. Знаходзім гэта ў перапісе „правентаў“ мястэчка Нарвы. Значыла б тое, што сённяшні Пудлес-Дзянісава ў XVI стагоддзі быў ва ўладанні нейкага нараўскага мешчаніна. У назве „Сахаркі“ можна было б дашукацца, што яе пачатак выводзіцца ад слова „сахор“ — драўляныя двухзубавыя вілы да сена ці гною. „Сакі“ — гэта, несумненна, вельмі даўняя назва, магчыма паходзіць ад „сака“, „сачка“ — г. зн. „рыбалоўная сетка“ або нават — „пасудзіна, якой мералі мёд“. „Полька“ — назва, узятая ад слова „поле“, бо „полька“ — гэта невялічкае поле. Тое самае можна сказаць аб назвах „Круглы Лясок“ ці „Аднога“. Гэтая апошняя абазначала калісьці адгалінаванне лесу, лугу ці мо рэчкі.


Але найбольш загадкавая — „Мацейкава Гара“. Няхай шкадуе той, хто не наведаў гэтай прыгожай мясціны, незвычайнага твору прыроды. Гара метраў на 20 стромка падымаецца над далінаю ракі Нарвы, дзе ў яе з правага боку ўпадае рэчка Руднік. З яе вяршыні прасціраецца маляўнічы краявід кіламетраў на 15—20 навокал. Дасканалае месца на колішнюю сярэдневяковую крэпасць. Надрэчную Мацейкаву Гару аддзяляе ад сушы даволі шырокае балота і нейкае дзіўнае паглыбленне, што быццам злучае багну з ракою Нарвай. Ці не след гэта ад колішняга абароннага рову?

Легенда кажа, што даўным-даўно жыў тут дужы разбойнік Мацейка. Нікога і нічога ён не баяўся. Грабіў купцоў на людным гасцінцы, што паблізу вёў з заходніх краін ва ўсходнія, нападаў на чаўны і лодкі, калі плылі па рацэ. А каб зручней было перапмаць падарожных, загадаў сваім палоннікам пракапаць новае русла ракі. Паплыла з таго часу Нарва пад самай гарою, і ніводзін вандраўнік не змог абмінуць страшнай сустрэчы з Мацейкам. Мацнела крэпасць разбойніка, і пухлі ў ёй ад золата сундукі.

У цёмныя асеннія і зімовыя ночы, калі хваля на рацэ цяжка ўздыхала ды ад віхуры стагнаў лес, спраўляў Мацейка свае балі. Забаўляўся з прыгажунямі-паланянкамі нядобрым каханнем. На світанку канчалася гульбішча і целы замучаных нявольніц абмывала рачная тонь.

Але здарылася, што Мацейка закахаўся ў адну са сваіх нявольніц. Ахвяраваў ёй золата і багацці, кляўся ў вернасці. Аднак дзяўчына, замест раскошнага жыцця з разбойнікам, выбрала сабе смерць. У такую ж цёмную віхурыстую ноч павесілася на ўласнай пышнай касе. Разбойніка ахапіла роспач. Загадаў ён справіць сваёй каханай урачыстае пахаванне, вымураваць глыбокі склеп. Калі ж апусцілі туды цела паланянкі, Мацейка таксама сышоў у магілу і сказаў замураваць сябе разам з каханай.

Так гаворыць легенда. Старэйшыя людзі ў Мацейкавай Гары яшчэ і цяпер паказваюць месца, дзе, праўдападобна, знаходзіцца склеп. На тым месцы не хоча расці збожжа і начамі, кажуць, нешта страшыць.



Памяць аб загінуўшых савецкіх партызанах і іх сябрах з вёскі Полька ўшаноўвае помнік.

Да прыходу народнай улады сяляне з Мацейкавай Гары і навакольных вёсачак, каб неяк пражыць, працавалі ў лесе і сплаўлялі дрэва па Нарве. За „сезон“ па некалькі разоў плылі з „арэлькаю“ ў далёкі Тыкоцін. Дзяўчаты і жанчыны наймаліся ў лясніцтве „дзерці пасы“ і садзіць лес.

У міжваенны перыяд актыўна дзейнічала тут Камуністычная партыя Заходняй Беларусі і Грамада, а ў часе нямецкай акупацыі партызаны мелі сталую базу і атрымлівалі дапамогу ад мясцовых жыхароў. Аднойчы фашысцкія карнікі знячэўку напалі на вёсачку Полька, пастралялі ўсіх мужчын, а ў іх ліку і трох савецкіх партызан. Жанчын з дзяцьмі вывезлі, а ўсе будынкі пусцілі з дымам. Але гэта не загамавала супрацоўніцтва насельніцтва з партызанамі, не запалохала людзей, прагных барацьбы супраць ненавіснага акупанта.

З гэтых ваколіц выйшла шэраг выдатных людзей, сярод іх заслужаны палкоўнік авіяцыі Міхал Палех і вядомы публіцыст „Жолнежа Вольнасці“ Міхал Андрушкевіч — аўтар цікавых успамінаў „Z notatnikiem w plecaku“. У гэтай кнізе М. Андрушкевіч адводзіць шмат месца сваёй роднай Мацейкавай Гары і Беласточчыне. У Польцы жыве і выдатна гаспадарыць слаўны на ўсё нашае ваяводства Лявон Казбярук — перадавік па вырошчванню збожжа і жывёлагадоўлі, дэлегат VI З'езду ПАРП, удзельнік нарады перадавых сялян краіны з I сакратаром ПАРП тав. Эдвардам Геркам.

Цяпер вёсачка Аднога напярэдадні новага гаспадарчага ўздыму, праводзіцца тут камасацыя зямлі і лугоў, а па старому пясчанаму гасцінцу, што калісьці вёў з Мазоўша на Беларусь, пракладваецца сучасная шаша.

Міхалай Гайдук
фота аўтара

Выстаўка савецкіх альбомаў, пласцінак і прэсы

З нагоды 56-ай гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі Клуб міжнароднай кніжкі і прэсы ў Беластоку зрабіў выстаўку савецкіх альбомаў, пласцінак і прэсы. 8 лістапада выстаўку адкрыў I сакратар пасольства СССР у Варшаве Сяргей Маслаў.

Надзвычай цікавая выстаўка ў клубе МПіК дала магчымасць беластачанам паглыбіць свае веды аб краіне Саветаў, аб яе культуры. Неабходна адзначыць, што ўсе выдавецтвы, прадстаўленыя на выстаўцы, можна купіць у кнігарні МПіК-у.

Найбольш цікавымі з'яўляюцца савецкія альбомы аб мастацтве, паказваючыя творчасць савецкіх мастакоў і найлепшыя здабыткі сусветнага мастацтва.

На выстаўцы шырока прадстаўлена савецкая прэса, якую распаўсюджвае клуб МПіК-у.

Шмат месца на выстаўцы займаюць савецкія пласцінкі з сімфанічнай і лёгкай музыкай. Запісаны на іх творы найлепшых рускіх і савецкіх кампазітараў Чайкоўскага, Пракофьева, Шастаковіча і іншых, а таксама творы ў выкананні майстроў мастацтва — піяніста Святаслава Рыхтэра, скрыпачоў Давіда і Ігара Ойстраха і іншых. Ёсць пласцінкі з песнямі і дэкламацыямі аб Леніне.

Ёсць і лёгкая музыка ў выкананні Мусліма Магамаева, Эдыты Пехі, старынныя рамансы і народныя песні.

(ач)

Ці ведаеце што...

...зараз на Беласточчыне дзейнічае 27 малачарскіх прадпрыемстваў і 3 165 пунктаў скупкі малака.

...усе малачарскія прадпрыемствы на Беласточчыне перапрацоўваюць паўмільярда літраў малака ў год.

...беластоцкая ваяводская арганізацыя ЛЗС налічвае 43 558 членаў, у тым ліку 11.475 жанчын.

...у Беластоцкім ваяводстве найбольш гурткоў ЛЗС дзейнічае ў паветах: Беластоцкім, Бельскім, Замброўскім, Ломжынскім, Манецкім, Сямяцкім і Сакольскім.

(яц)

ЛІСТ З ЗАДРЫПАНКІ

Гапка рыхтуецца ў Сопат

Сон Гапкі не збыўся, не вылучылі яе ў кандыдаты на радную, але ад гэтага (слухайце, няўдачнікі!) тонус яе жыццядзейнасці не панізіўся.

— Не хочуць задрыпанцы мяне, тым горш для іх, — канстатавала, — відаць, не дараслі да сонечных пераўтварэнняў.

І апанавала Гапку новая ідэя: песенны конкурс БГКТ. І баюся, каб наша сонная Задрыпанка не пераўтварылася ў Садом і Гамору. Вогненны дождж падае не толькі на маю галаву, але сячэ і суседзяў.

Ад самай раніцы да позняй ночы Гапка „ставіць“ свой голас: на поўны рэгулятар. Тут мажор (а чаму ж цябе пярун не забіў!) часта змяняе мінор (ой, рэчанька, рэчанька, чаму ж ты няпоўная), а чужацкую дамінанту— „ча-ча-ча“ сваяцкая — „о, ля! о, ля! о, ля!“

За адным захадам старыя песні Гапка мадэрнізуе: у „Лявонісе“ сказ перасякае (А Лявоніха ня жонка была — о, ля! о, ля! о, ля! Нямытую мне кашульку дала, ча-ча-ча!), а ў „Рэчаньцы“ сказ пакідае цэлым, узмацняючы толькі дамінантай „о, ля!“

Але найбольш творчай ініцыятывы Гапка праяўляе ў інтэрмедыях, калі вычарпаўшы ўвесь песенны запас, пачынае класці на музыку свае лібрэта. Не жыццё ў нас, а аперэтка! Прадстаўлені бясплатныя для цэлай Задрыпанкі.

Нельга сказаць, што Гапка не ідзе з духам часу. Адкрыўшы ў сябе значныя галасавыя рэзервы, яна ўзяла раўненне на Сасніцкую (раўняецца на найлепшых!). Мінімалісткай яна ніколі не была, а тут дайшоў дадатковы стымул: пайшла чутка, што лаўрэаты конкурсу паедуць на гастролі ў Сопат. Паставіла тады Гапка на ўсе 30 пунктаў. Больш правілы конкурсу здабыць не дазваляюць. Шкада: яўнае абмежаванне дынамічных натураў. Шэранька, роўненька. Голас: у дыяпазоне 1—10, інтэрпрэтацыя: там-жа, рэпертуар: ibidem.

А мо ў гэтым маё збавенне? Цяжка ўявіць, якое Гапка магла б учыніць вавілонскае стоўпатварэнне, калі б за голас можна было здабыць, напрыклад, 100 пунктаў.

А інтэрпрэтацыя! Калі Гапка даходзіць у „Лявонісе“ да слоў „а чаму ж цябе пярун не забіў“, дык так ляскае, такія вогненныя бліскавіцы пускае, што кожнае журы (нават з прадстаўніком ГП) не ўседзіць раўнадушна на сваім адказным пасту. А тут можна высмаліць толькі 10 пунктаў.

Застаецца рэпертуар. Прыпомніла Гапка папярэднія конкурсы і дайшла да вываду, што найбольш хваляць за ўласную творчасць. Асабліва аб гэтым нагадваў поспех гарадоцкіх частушак Мушынскай. А чым Задрыпанка горшая за Гарадок? І Гапка пачала складаць частушкі задрыпанскія.

Вось адна пробка:

Выцякае вада з чайніка,
О, ля! о, ля! о, ля!
Палюбіла я начальніка,
Ча-ча-ча-чальніка!

А вось і другая:

Палюбіла я Даніла,
О, ля! о, ля! о, ля!
А ў Даніла жонка міла
О, ля!!!

У першай, як вы прыкмецілі, сучаснасць не толькі „о, ля“ і „ча-ча“, але перш за ўсё ў слове „начальніка“. Скажаце, вада, што выцякае з вышэй успамянутай пасудзіны, можа намякаць на пэўныя арганізацыйныя непаладкі ў гміне: калі нехта пачне тлумачыць, што чайнік стары і дзіравы. Але з кудзі найлепшым поспехам можна даказаць зусім іншае: кіпіць у гміне стваральная дзейнасць і пераадольвае яна ўжо раней накрэсленыя рубяжы. Зрэшты, калі нават прыняць і першы варыянт, дык начальнік тут ні пры чым. Яго ж любяць. А ў Гапкінай інтэрпрэтацыі выглядае гэта вельмі пераканаўча, і я ўпэўнены, што ў гэты момант кожны начальнік не выседзіць раўнадушна ў сваім ганаровым крэсле і пастараецца зрабіць адпаведныя захады, каб журы ўлічыла і яго думку.

Другая пробка ўсхваляе маю мужчынскую прынцыповасць. Праўда, тут так сказана, што ўся ўвага звернута не на мяне, а на жонку (гэты куплет Гапка падрыхтавала для напарніцы ў дуэце), але такога падыходу і патрабуе Гапкіна тактыка: усімі спосабамі да перамогі!

Цікава, ці возьме мяне ў Сопат? Тэарэтычна 30 пунктаў у яе.

Ваш Даніла

 © PDF: Kamunikat.org 2023

Пачатак на стар. 1



— Перш за ўсё я хацеў бы падкрэсліць маё зацікаўленне праблематыкай, якая, здаецца мне, з'яўляецца істотнай для тэарэтычных і практычных, прыгодных для гаспадаркі патрэб; менавіта было гэта зацікаўленне паказчыкамі гаспадарчага ўзросту і метадамі лічэння тэмпа гэтага ўзросту.

Мае дасягненні, як вы сказалі, сталіся магчымымі бадай таму, што я трапна выбраў аб'ект сваіх доследаў. Часта кажуць, што людзі з сялянскіх асяроддзяў натрапляюць на значныя перашкоды ў навуковай працы. Многа ў гэтым праўды, але сялянскае жыццё выпрацоўвае такія рысы характару, як сістэматычнасць, упартасць, а гэта ж у сваю чаргу спрыяльны фактар для навуковай дзейнасці.

— На суперабложцы Вашай габілітацыйнай дысертацыі рэдакцыя Эканамічнага дзяржаўнага выдавецтва (PWE) звяртае ўвагу на тое, што аўтар „Прадстаўляе таксама ўласны метад лічэння нормы ўзросту, ілюстрацыяй якога з'яўляецца табліца сярэдняга гадавога тэмпа ўзросту...“ Вельмі просім сказаць, у магчыма сціслай форме, у чым заключаецца сэнс і значэнне гэтага метаду, які ў рэцэнзіях[3]), згодна, зрэшты, з Вашым акрэсленнем, называюць метадам.

— Метад гэты дазваляе атрымаць матэматычным шляхам адказ на пытанне, як хутка змяняюцца канкрэтныя эканамічныя катэгорыі, напрыклад, нацыянальны даход, вытворчасць паасобных прадуктаў, зарплата і г.д.; інакш кажучы, які тэмп развіцця гэтых катэгорый. Прымяняемы ў практыцы метад (сярэдняй геаметрычнай) бярэ пад увагу толькі пачатковую і канчатковую вартасць. Мой метад патрабуе ўлічвання вартасцей прамежных перыядаў. Паяснім гэта на прыкладзе: скажам, што нейкі грамадзянін, назавем яго А, на працягу 5 гадоў атрымаў зарплату (у працэнтах): 100, 100, 100, 100, 200, а другі грамадзянін, назавем яго Б: 100, 200, 200, 200, 200. Карыстаючыся традыцыйным метадам, мы дойдзем да пераканання, што ў адным і другім выпадку зарплата ўзрастала ў тым самым тэмпе. У сапраўднасці шпарчэйшы тэмп узросту зарплаты выступае ў грамадзяніна Б, але гэта можна сцвердзіць толькі пры дапамозе майго метаду, традыцыйны метад такой розніцы не вылаўлівае. Так, зразумела, вельмі ўпрошчваючы праблему, можна адказаць на пытанне пра сэнс метаду.

— А ці не сказалі б Вы, як сакратар вузаўскага камітэта ПАРП Варшаўскага універсітэта, многагадовы сакратар наборачнай камісіі гэтага ж універсітэта, хоць бы некалькі слоў аб сваёй грамадскай працы?

— Думаю, што каб займацца грамадскай працай, трэба мець да гэтага натуральныя схільнасці характару і, зразумела, адчуваць, што такая дзейнасць патрэбна. Мая грамадская праца найбольш звязана з дзейнасцю ў Саюзе польскай моладзі (ЗМП) — гэта школьныя і студэнцкія гады, а потым — у ПАРП. Грамадская дзейнасць прымушае дзяліць час паміж ёю і прафесіянальнай працай, дае аднак вялікае задавальненне.

Да нашай размовы прыслухоўваецца, пакінуўшы на момант счытванне аўтарскай карэкты падрыхтоўваемага да друку эксперыментальнага падручніка хіміі для хімічных тэхнікумаў, жонка дацэнта, др Эльжбета, таксама навуковы супрацоўнік Варшаўскага універсітэта, вядомы прафсаюзны дзеяч гэтага вуза.

Гэтым разам стаўлю пытанне для абодвух:

— Ці ўдаецца Вам, пры такой колькасці навуковай і грамадскай працы, рацыянальна арганізоўваць свой адпачынак?

— Ну, што ж, — кажа др Эльжбета, — турысцкія паездкі сталі магчымымі толькі ад 1971 года.

— Пасля таго, як бацькі мае, якія пражываюць у маёй роднай вёсцы Шчыты, што на Бельшчыне, — дадае дац. І. Цімафеюк, — перадалі гаспадарку дзяржаве за пенсію. Да гэтага года водпускі мы праводзілі на вёсцы, працуючы ў бацькоў. Гэта быў адпачынак ад разумовай працы і гарадскога жыцця, але не гэтым кіраваліся мы, едучы на вёску, — абавязкам нашым было дапамагчы бацькам у іх цяжкой сялянскай працы, асабліва ва ўборачны перыяд, а ў размовах з сябрамі чуліся жарты, што мы, па прыкладу „сялянарабочых“, сталіся прадстаўнікамі новай прафесіі, якую можна назваць „вучонасяляне“. Бацькі, пакуль мелі сілы, заўсёды стараліся добра гаспадарыць. Лічылі, што зямля павінна быць так дагледжанай, каб давала добрыя ўраджаі.

Гутарка набліжаецца да канца. Дзякую за размову.

— Сардэчнае прывітанне Беласточчыне, — чую на развітанне.

Гутарку правёў
Мікалай С. Врублеўскі

[1]) Igor Timofiejuk
Mierniki wzrostu gospodarczego. Wydanie drugie, przejrzane i uzupełnione. Państwowe Wydawnictwo Ekonomiczne. Warszawa, 1973.

[2]) Igor Timofiejuk
Stopa wzrostu gospodarczego. Metody liczenia. Państwowe Wydawnictwo Ekonomiczne. Warszawa, 1973.

[3]) Напрыклад:
„Życie gospodarcze” Nr 35 z 2.IX.1973

СУСТРЭЧЫ З КАНДЫДАТАМІ Ў РАДЫ НАРАДОВЫЯ





Быў шэры асенні надвячорак, калі мы сустрэлі Янку Асіпюка — трактарыста з сельскагаспадарчага кааператыва ў Крывой Бельскага павету. Пасля працавітага дня пры звозцы бручкі з поля ён ужо кіраваў трактар у гараж. Відаць было, што хлопец змучаны і празяблы, але калі пайшла ў нас гаворка пра навіны ў іхнім кааператыве, ён адразу ажывіўся.

— Наш кааператыў спецыялізуецца ў гадоўлі. Маем каля 200 дойных кароў і маладняку, каля 100 авечак, дзве вялікія птушкафермы ў Зубаве і Кнаразах. І на палях таксама ўсё спорыцца. Збожжа дало амаль па 40 цэнтнераў з гектара, удаліся цукровыя і кармавыя буракі, бручка. Людзі ў нас жывуць заможна. У большасці членаў кааператыва ёсць тэлевізары, радыёпрыёмнікі, пральні, пыласосы. І легкавыя машыны паяўляюцца, маюць іх ужо Рыгор Стральчук і Анатоль Гаркавы, іншыя таксама намерваюцца набыць. І будуюцца людзі. Прасторныя, светлыя, зусім не горшыя, чым у горадзе, муразанкі з цэнтральным абаграваннем і водаправодам ставяць Піліп Асіпюк, Уладзімір Весялоўскі, Янка Петручук, Анатоль Раманюк...

Янка Асіпюк — малады чалавек, нарадзіўся ён у 1951 годзе ў сям'і члена кааператыва. Пачатковую школу закончыў у сваім родным сяле, потым — курс трактарыстаў у ПОМ-е ў Бельску Падляшскім і вось ужо другі год працуе на трактары „Урсус Ц-330“. Актыўны, старанны, дбайны. Моладзь з гуртка Саюза сацыялістычнай сялянскай моладзі ў Крывой выбрала яго сваім старшынёю.

— Як разгортваецца праца ў вашым гуртку?

— Членаў маем нямнога, усяго 12 чалавек. Але гэта моладзь актыўная, з ініцыятывай. У часе жніва працавалі ў полі. Цяпер намерваемся будаваць святліцу. Ужо грамадскім чынам навазілі жвіру, ёсць таксама 70 тысяч злотых на пабудову. Выбралі і адобрылі праект будынку, будзе ў ім глядзельная зала са сцэнай, пакой на рэпетыцыі, бібліятэка і іншыя памяшканні. Восенню моладзь садзіла дрэўцы паабапал дарогі з сяла да шашы. Праводзім вечарыны з віктарынамі, арганізуем і танцавальныя вечары, каб мець за што купіць у новую святліцу магнетафон і праігрывацель, пласцінкі, настольныя гульні. Нядрэнна ў нас таксама і са спортам. Наша футбольная каманда займае адно з добрых месц у павеце. Сёлета выйгралі з Мокрым, Міклашамі, Казламі. Маем добрага нападаючага Леаніда Башуна і варатар наш Васіль Раманюк таксама не падводзіць. Трэніруемся і іграем на сваёй спартыўнай пляцоўцы, што самі пабудавалі.

(Працяг са стар. 1)

З ВОПЫТУ НАЧАЛЬНІКА ГМІНЫ



сельнік і амаль трыццаць сялян з іншых вёсак.

У распараджэнні гміны застаюцца цяпер фінансавыя сродкі на падтрымку грамадскіх чынаў. Выкарыстоўваем іх, каб пабудаваць святліцу ў Старым Корніне і Грабаўцы, каб упарадкаваць дарогі ў вёскі Ягаднікі і Вітава. Гэта дае нам магчымасць больш аператыўна выконваць нашу арганізатарскую дзейнасць.

— Якое рашэнне найцяжэй было вам падпісаць?

— Начальнік гміны амаль кожны дзень вымушаны рашаць цяжкія праблемы. Мне дапамагаюць у гэтым добра падрыхтаваныя людзі, якія цяпер працуюць у выканаўчым апараце гміны. Я таксама заўсёды раюся з мясцовымі актывістамі і павятовымі ўладамі. Аднак адказнасці за мае рашэнні ніхто з мяне зняць не можа. Вось ужо на пачатку сваёй працы на пасадзе начальніка прыйшлося мне ануляваць звыш 300 тысяч злотых незаплачанага зямельнага налогу. І я гэта рашэнне прыняў, хаця ведаў, што за яго мяне не пахваляць, але быў перакананы, што яно абсалютна патрэбна, каб задоўжаныя сяляне ўвогуле маглі надалей гаспадарыць.

Пакідаў я Дубічы Царкоўныя ўжо вечарам. У мокрай асфальтаванай вуліцы пераліваласа электрычнае святло.

— Шырокай вам дарогі, — сказаў на развітанне начальнік Дубіцкай гміны.

— І вам таксама! — адказаў я яму.

Віктар Рудчык



Нашаніўская пара

ЯДВІГІН Ш. — ЧАСТКА XVIII

Публіцыстыка. Сустракаючыся з фактам распродажу сялянам панскай зямлі, Ядвігін Ш. ставіцца да яго наогул адмоўна. Ідэйная пазіцыя аўтара ў даным выпадку даволі няясная. Ядвігіну Ш. не падабаецца тое, што распадаюцца вялікія панскія гаспадаркі на вузкія сялянскія шнуры, што сяляне будуць жыць паасобку, а не супольнай вялікай грамадой. Такія закіды гучаць, амаль як заклік да калектыўнага гаспадарання. Аднак, ведаючы ідэалогію пісьменніка, цяжка было б прыпісваць яму імкненне да калектыўных форм сялянскага жыцця. Паслухайма пісьменніка: „Сумна. Не дзеля таго сумна, што веліч гэтага двара гіне... а сумна, што гэтыя дубы гінуць не пад навалай культуры, а ад сваёй уласнай парахні... А чаму? Бо прыйшла сюды свядомая грамада людзей, а прыйшлі яны ўрассыпную і жыць будуць урассыпную, не для агульнага дабра, а кожны сабе, кожны паасобку.

...Там, дзе даўней пры добрай машыне, культурнай гаспадарцы ў адзін дзень пры малой працы клаліся сотні снапоў, цяпер дзеля гэтых самых снапоў пойдуць сотні людзей набіваць мазалі, падрываць свае высахшыя грудзі, класці хлеб на ахвяру свайго здароўя, дый ад зямлі не здолеюць узяць таго, што можна.

...Так будзе датуль, пакуль кожны з нас не зразумее, што нават у шчасці жыць самому і толькі дзеля сябе нельга. Трэба, каб жаданне грамады было маім жаданнем, яе доля — маёй доляй, яе шчасце — маім шчасцем, яе думкі — маімі, яе святло — маім“.

Асобнай праблемай, якая займае сур'ёзнае месца ў публіцыстыцы Ядвігіна Ш., з'яўляецца справа інтэлігенцыі. У многіх выпадках звязана яна з нацыянальным або сялянскім пытаннем.

Ядвігін Ш. балюча перажываў тое, што беларуская інтэлігенцыя, вырасшая з сялянства, абыякава або нават варожа адносілася да беларускай мовы і да культурных патрэб беларускага сялянства.

Паслухайма, як пісьменнік характарызуе беларускіх інтэлігентаў-выхадцаў з народа. „Але жаль, вялікі жаль я маю да тых, хто, як тыя курчаты, вылупіўшыся пад саламянай страхой, за апошнія бацькаўскія крывавыя грошы прыждалі надзець модныя з бліскучымі гузікамі курткі, дый цяпер цураюцца сваёй роднай мовы. Але, калі ўжо дагэтуль мова беларуская захавалася і жыве, то жыць будзе, то ёсць і гаспадар яе — гэта сам народ, а як не гіне народ з нацыянальнай душой, то і не загіне беларускі народ“.

У „Лістах з дарогі“ выступае тыпова народніцка-пазітывістычны заклік пісьменніка ў адрас інтэлігенцыі, якая павінна ісці пад сялянскія стрэхі і несці туды прамені асветы і навукі. Вось адзін з такіх заклікаў:

„Дык не цурацца, не заракацца трэба гэтага народа, а ісці на сустрэчу яго жаданням, яго думкам. Хай кожны, каму дораг свой родны край, загляне хоць у бліжэйшыя вёскі, загляне пад падгніўшыя стрэхі хатак, хай дзеліцца сваімі думкамі, радамі, вестачкамі, а пэўне сустрэне там прыхільнасць.

...Хай кожны святлейшы чалавек ідзе паміж гэтага народу і запальвае паміж яго светач навукі, свядомасці і справядлівасці і гэткім парадкам сплачае хоць частку таго доўгу, які ён зацягнуў перад роднай сваёй старонкай, каторая ўскалыхала і ўзгадавала яго“.

Досыць рэзка асудзіў Ядвігін Ш. сістэму асветы ў Беларусі і тое, што даволі часта адукаваныя асобы высылаюцца ўладамі ў далёкія куткі імперыі:

„Моладзь ірвецца да прасветы, але тыя рамкі, у якіх уціснута цяпер навука нашых школ, даюць столькі карысці, колькі можа мець галодны чалавек, калі яму вымазаць вусны салам. Дык і вучаць там, як вядома, не ў роднай беларускай мове, а ў расійскай.

...Бывае яшчэ горш, прыходзіцца кідаць родную старонку і шукаць хлеба на чужыне. А гэта найбольшая страта, якая можа быць для вёскі; бо гэткім парадкам вызбываюцца суседзі разумнейшых з паміж сябе людзей, каторыя мо патрапілі б кіраваць не адзін прамень святлейшы ў сваю вёску“.

Прыведзеныя фрагменты „Лістоў з дарогі “ Ядвігіна Ш. заключаюць у сябе толькі частку тых шматлікіх праблем, якія выступілі ва ўсёй публіцыстыцы пісьменніка.

Аднак ужо са сказанага вынікае, што тэматычны круг публіцыстыкі Ядвігіна Ш. вельмі шырокі. Амаль усе істотныя праблемы сацыяльнага, культурнага і нацыянальнага жыцця Беларусі знайшлі ў ёй большае або меншае адлюстраванне. Канчаючы інфармацыю аб публіцыстыцы пісьменніка, трэба сказаць, што выступілі ў ёй характэрныя і для яго мастацкай творчасці непаслядоўнасць і абмежаванне.

 © PDF: Kamunikat.org 2023

У жніўні гэтага года ў жыцці Янкі Асіпюка адбылася вялікая падзея — ён прыняты ў кандыдаты Польскай аб'яднанай рабочай партыі. У набліжаючыхся выбарах у рады народовыя ён тыпаваны кандыдатам у радныя Ваяводскай рады народовай.

— Якія па-вашаму, галіны сельскага жыцця вымагаюць асаблівай увагі?

— Перш за ўсё мы ўсе павінны імкнуцца павышаць агратэхнічны ўзровень гаспадарання на палях і ўводзіць сучасныя метады гадоўлі, у большай меры і рацыянальна прымяняць штучныя ўгнаенні, няспынна павышаць ураджаі і павялічваць гадоўлю. Трэба таксама мабілізаваць людзей да грамадскіх чыноў, асабліва пры пабудове дарог. У нас, напрыклад, амаль усе дарогі ў ваколіцы Крывой пабудаваны ў чыне. Больш увагі трэба адвесці моладзі, не падрыхтоўцы да працы ў сельскай гаспадарцы, а таксама стварыць ёй лепшыя ўмовы для культурнага адпачынку. Неабходна ўздзейнічаць на сялян, каб больш чым дагэтуль клапаціліся пра належны выгляд сваіх панадворкаў, будынкаў, вуліц. Шмат яшчэ трэба зрабіць у галіне палепшання забеспячэння вясковых крамаў не толькі прамысловымі таварамі, але і прадуктовымі. Наша сельская гаспадарка становіцца ўсё больш таварнай, паасобныя гаспадары спецыялізуюцца ў адной галіне і таму гандлёвыя арганізацыі павінны забяспечваць іх тымі прадуктамі, якіх яны не могуць нарыхтаваць у сябе. Машынны парк, што цяпер ужо ёсць на сяле, вымагае больш рацыянальнага выкарыстання і больш дбайных адносін да яго. Словам, нашым сёлам трэба няспынна павышаць узровень сваёй гаспадаркі і дбаць пра культуру ў штодзённым жыцці.

Размову правёў **Мікалай Гайдук**

З ГРУЗАМ У ЛЕС


Гайнаўшчына багата лясамі, пра якія гавораць, што яна наша зялёнае золата. У лес ходзім за ягадамі і грыбамі. Любім тут адпачываць. Шкада толькі, што нашы зялёныя жамчужыны — Белавежская пушча і драбнейшыя лясныя масівы за апошнія гады зміняюцца не на карысць.

Празмерная вырубка лесу, а перш за ўсё старадрэваў, напэўна адмоўная з'ява ў галіне лясной гаспадаркі. Не менш турбуе нас засмечванне лясоў усялякімі адпадкамі прамысловага паходжання, не прыдатнымі да далейшага выкарыстання. У лес трузавікі вывозяць пабітыя шкляныя бутэлькі, шкло з шыбаў і ўсялякага роду посуд з пластмасы, кавалкі вырабаў з розных металаў, макулатуры. Машыны з розных установ і прадпрыемстваў заязджаюць у лес і тут жа разгружаюцца на абочыне дарогі або сцяжынкі. Кучы такога рознага ламачча знаходзяцца ў хвойніку ля дарогі з Нараўкі ў Міклашэва, непадалёку, а нават за плотам пачатковай школы ў Старыне (таксама ў хвойніку), на ўскраіне Белавежскай пушчы з боку прамысловага горада Гайнаўка. Пабітую цэглу-дзюркаўку або дрэнацыйныя трубкі знойдзем на ўзлесках па дарозе Ляўкова—Лука.

Пара, каб месцамі звалкі ўсялякага смецця пацікавіліся органы міліцыі. Неабходна лавіць шафёраў аўтамашын, якія не выпадкова, але пастаянна вояць усялякія адпадкі ў лес і выкідаюць іх чуць не на дарогу. (ця)

Ф·А·Л·Ь·К·Л·О·Р

ЛЮБОЎНАЯ



Нэ выкопавшы ў полю крынічэнькі,
То й нэ міеті воды.
Нэ выкохавшы змалу дієвчыноньку,
То й нэ міеті жоны.
Ой, выкопаю новы я колодэць
У сэбэ на дворы.
Ой, чы нэ прыйдэ красна
дієвчынонька
По водоньку ко мніе?
Ой, чы нэ прыйдэ красна
дієвчынонька
По водоньку ко мніе?
Ой, гляну, гляну я в окенэчко —
Дробны дождэжык ідэ.

Ой, жэ бо моя красна дієвчынонька
По водоньку ідэ.
Ой, гляну, гляну я й во другое —
Голубы воду п'ют.
А вжэ й бо мою красну
дієвчыноньку
До шлюбу вэдут.
Ой, одін вэдэ за білую ручку,
А другому — жаль-жаль.
А трэті стоіт, слёзкі дробны роніт:
Хто любіў, той нэ взяў.
А трэті стоіт, слёзкі дробны роніт:
Хто любіў, той нэ взяў.

Ад Анны Стахвіюк, 1924 года нараджэння, вёска Трасцянка Гайнаўскага павету, запісаў 2 жніўня 1973 года Мікалай Гайдук. Нотны запіс з магнетафоннай стужкі зрабіла Людміла Панько.

Песню спявалі на вечарынках пры пражы кудзелі.

Кубак для найлепшых прапагандыстаў „Нівы"

Праўленне павятовага аддзела БГКТ у Гайнаўцы арганізавала конкурс на пераходны кубак аддзела БГКТ і навятовай паштовай установы. Перамаглі пісьманосцы з пошты ў Старым Корніне — Ян Петручук і Уладзімір Місеюк. Маюць яны па 150 і 120 падпісчыкаў на „Ніву". Высокае дасягненне старакорнінскіх пісьманосцаў гэта таксама заслуга начальніка гэтай пошты Кірыла Кудэрскага. Вялікіх поспехаў у падпісцы на беларускі тыднёвік „Ніва" дабіліся пісьманосцы: Мікалай Панфілюк з Дубіч Царкоўных (116 экземпляраў), Васіль Вялькевіч з Чыжоў (112 экземпляраў), Аляксандр Сахарчук з Клейнік (108 экземпляраў) і іншыя. Усе пісьманосцы — лепшыя прапагандысты „Нівы" — атрымалі рэчавыя ўзнагароды ад рэдакцыі „Нівы" і дыпломныя ўзнагароды ад імя дырэкцыі павятовай паштовай установы ў Гайнаўцы. (ця)



Начальнік пошты ў Старым Корніне Кірыл Кудэрскі задаволены ўзнагародай і абяцае затрымаць кубак у сябе многія гады.

Фота В. Рудчыка

БРАВА, МОЛАДЗЬ З МІКЛАШЭВА!

Актыўная моладзь жыве ў вёсцы Міклашэва Гайнаўскага павету. Ёсць тут 25 дзяўчат і юнакоў. Багатую дзейнасць раней тут „раскручваў" былы старшыня гуртка ЗСМВ Аляксандр Дрозд, а зараз за работу ўзяўся новы старшыня гуртка Павел Каліноўскі.

Дружная міклашэўская моладзь штогод ахвотна дапамагае інвалідам, удовам і пажылым жыхарам вёскі пры ўборцы збожжавых культур улетку, а таксама пры капанні бульбы восенню. Больш 450 гадзін прапрацавалі хлопцы і дзяўчаты сёлета пры жніве. Не менш працавалі на полі сваіх падапечных у час капання бульбы. Моладзь ахвотна арганізавала таксама ў сябе добрасуседскую дапамогу. Асабліва многа дапамаглі ў час руплівых палявых работ Марыі Красоўскай, Фёдару Матысяку, Кацярыне Дрозд, Анне Каліноўскай, Сымону Семяняку, Мікалаю Сухадоле, Кастусю Трусевічу, Аляксандру Матысяку і іншым, патрабуючым рук да працы, асабліва ў гарачы час. У далейшым моладзь намерана паклапаціцца аб апале для ўдавы Марыі Красоўскай.

Сёлета на славу папрацавалі Уладзіслаў Каліноўскі, Яўген Трусевіч, Павел Каліноўскі, Барыс Салагуба, Пётр Каліноўскі, Аляксандр Дрозд, Ірэна Дрозд, Аляксандр Леванеўскі і Антон Каліноўскі.

Маладыя з Міклашэва вядомыя ў цэлай ваколіцы сваім удзелам у грамадскіх чынах (асабліва пры пабудове дарогі), у турніры вёсак Міклашэва—Скупава, а таксама шматлікімі культурна-асветнымі мерапрыемствамі. У гэтым годзе міклашэўская моладзь заняла першае месца ў ваяводстве ў акцыі „Кожны колас на вагу золата". Мелі яны нават гонар злажыць рапарт аб акцыі і ўручыць дажынкавы вянок сакратару Ваяводскага камітэта партыі ў Беластоку Стэфану Завадзінскаму.

За вялікі поспех у акцыях „Кожны колас на вагу золата" і „Збіраем плады восені" міклашэўскія ЗСМВ-оўцы атрымалі рэчавыя ўзнагароды — музычныя інструменты і праігрывацель.

Насталі доўгія вечары. Міклашэўская моладзь намерана ў гэты час арганізаваць сустрэчы з моладдзю з суседніх вёсак, а перш за ўсё з моладдзю Масева. Плануюць яны забавы, конкурсы, згадуй-згадулі. Зімою моладзь намерана арганізаваць кулік у Белавежскую пушчу, навагодні баль і іншыя мерапрыемствы. Намецілі яны таксама арганізаваць курс асветна-палітычных ведаў і школу здароўя.

Я. Цялушэцкі

ДЗЕЦЯМ ТРЭБА ПАМАГЧЫ

Мінула ўжо лагодная залатая восень. Зіма стаіць ля нашага парога. Усё часцей наведвае нас рэзкі сівер з даждžом і снегам.

А дарога да школы сёлета яшчэ падоўжылася. Увядзенне новай сістэмы ў вясковае школьніцтва, арганізацыя зборных гмінных школ адсунула школу ад дзіцяці на значную адлегласць. Узамен за гэта кожнае вясковае дзіця атрымае адукацыю, якая не будзе адрозніваца ад той, якую выносіць са школы гарадское дзіця.

У большасці школ і з большасці вёсак наладжана падвозка дзяцей у школу. Але не ўсе яшчэ дзеці могуць гэтым дабрадзействам карыстацца. Таму, як і ў мінулыя гады, сёлета аб'яўлена вельмі карысная акцыя пад лозунгам „Шафёр, памажы дзіцяці".

Арганізатарам і каардынатарам акцыі з'яўляецца Таварыства сяброў дзяцей (ТПД), а суарганізатарамі — усе маладзёжныя арганізацыі, Куратория школьнай акругі, аддзел камунікацыі ВРН, ПЗУ, ПЗМот і іншыя.

Задача гэтых установ — шырока прапагандаваць акцыю сярод шафёраў. Бо кожны чалавек, ці то шафёр-прафесіянал, ці шафёр-аматар, ці нават вясковы дзядзька на возе, калі бачыць на дарозе дзіця, часта скуленае ад холаду, не можа спакойна мінуць яго і найчасцей прапануе дзіцяці месца ў сваёй машыне. Гэта простае пачуццё чалавечнасці падказвае людзям аказаць дапамогу дзіцяці.

Арганізатары ж хочуць, каб гэтая дапамога не засталася без падзякі. Таму прапануюць дзецям разам з падзякай за падвозку ўручаць шафёрам карткі. На картачцы можа быць напісана „Дзякую табе, шафёр" ці нейкая іншая форма падзякі. Такія карткі павінны, як прапануе штаб акцыі, дзеці зрабіць самі, можа, нават на ўроках малявання ці тэхнічных заняткаў. А апекавацца цэлай гэтай справай у школе павінен вызначаны настаўнік.

Усе дзеці ў школе, якія маюць намер карыстацца дапамогай падарожных шафёраў, павінны не толькі мець карткі, але і быць дакладна павучаны, як трэба весці сябе на дарогах, як можна бяспечна затрымоўваць машыны. З гэтай мэтай у дапамогу настаўніку аддзел асветы пераслаў ва ўсе школы спецыяльныя ўказанні, якія абавязкова трэба абмеркаваць з дзецьмі. Галоўнае ва ўсім гэтым, каб дзіцяці на дарозе не пагражала небяспека, каб дзіця затрымлівала машыну, не выходзячы на шашу, а знаходзячыся на бочнай сцежцы, толькі падняўшы руку. Вельмі добра спалучыць павучэнне дзяцей з экзаменам на веласіпедную карту.

Няхай жа кожнае дзіця таксама ведае, што шафёр не мае абавязку падвозіць дзяцей, а робіць гэта з добрага сэрца. Таму абавязак дзіцяці — падзякаваць, гэта значыць, уручыць прыгожую картку з падзякай.

А шафёры павінны збіраць і старанна перахоўваць карткі-падзякі, бо вясною будзе зроблена падсумаванне акцыі. Хто назбірае больш картак ад дзяцей, атрымае каштоўныя ўзнагароды. Шафёры, якія зоймуць дзесяць першых месц, атрымаюць ганаровыя адзнакі „Прыяцель дзіцяці". Сярод узнагарод, — частковая аплата за заграничныя экскурсіі.

Перасылаць сабраныя картачкі трэба будзе ў маі на адрас Ваяводскага праўлення ТПД, аддзела камунікацыі Прэзідыума ВРН або ў Павятовыя камэнды гуфцаў ЗГП.

Удзельнічаць у акцыі могуць усе шафёры аўтамашын, прыстасаваных да перавозкі людзей. Падсумаванне будзе праведзена ў трох катэгорыях: шафёры-прафесіяналы, шафёры-аматары і фурманы.

Арганізатары спадзяюцца, што сёлета акцыя „Шафёр, памажы дзіцяці" ахопіць яшчэ больш ахвотных памагчы дзецям, чым у мінулыя гады.

Яніна Чэрнякевіч

ЗАЛАТЫЯ ЮБІЛЯРЫ

На сесіі гмінай рады народовай у Шудзялаве былі ўручаны шасці парам ганаровыя медалі за доўгагадовае сумеснае сужыццё. Гэтыя медалі былі ўручаны парам, якія пражылі разам 50 год. Медалі ўручыў старшыня павятовай рады народовай у Саколцы — Мар'ян Бізюк, а атрымалі іх Максім Федзюкевіч і яго жонка Даміцыя, Антон Карпач і яго жонка Анеля, Эдвард Каліна і яго жонка Браніслава, усе з вёскі Піражкі, далей — Ігнась Шымчук і яго жонка Сцефанія, Міхась Парук і яго жонка Надзея — з вёскі Вярхлесе і Станіслаў Крушыневіч і яго жонка Анна з вёскі Бараўшчына.

Сваякі доўга віншавалі залатых юбіляраў і жадалі ім доўгіх год жыцця і добрага здароўя. Старшыня павятовай рады народовай у Саколцы таксама пажадаў доўгіх год жыцця і добрага здароўя ўсім узнагароджаным.

А. С.

© PDF: Kamunikat.org 2023

САРДЭЧНА ВІНШУЕМ!

Наш добры сябра



27 лістапада спаўняецца 70 год з дня нараджэння вядомага беларускага пісьменніка Піліпа Пестрака. Гэты юбілей амаль збегся з 50-й гадавінай утварэння КПЗБ — партыі, якая сыграла ў жыцці і літаратурнай творчасці Піліпа Пестрака выключную ролю.

Уступіў у яе ўвосень 1926 года. За ім было бежанскае, галоднае Паволжа, тыфуснае вітанне радзімы, з якога не выйшлі бацька, сястра і брат, праца лесарубам, войска. Перад ім — Грамада, ТБШ, падполле і турмы. 11 год турэмнага жыцця! Карцары, холад, галадоўкі.

І нягледзячы на ўсё — барацьба. Дарога многіх юнакоў былой Заходняй Беларусі. Адлюстраванне сваё знойдзе яна потым у рамане „Сустрэнемся на барыкадах“.

Кульмінацыя гэтай рэвалюцыйнай эпапеі адбываецца ў Беластоку. Героі рамана сустракаюцца менавіта на беластоцкіх барыкадах. Чуем на іх песню польскага пралетарыята:

Рыцары працы, рыцары духа,
Сёння да бою нам час настаў...

Бачым плячо ў плячо братоў па класу, палякаў і беларусаў, і нацэленыя ў іх вінтоўкі паліцыі. З'яўляемся сведкамі нараджэння новых міжнацыянальных суадносін.

Іх харужым Піліп Пестрак быў не толькі ў „Сустрэнемся на барыкадах“. Ён не раз наведваў нашу краіну і мы заўсёды з цікавасцю чыталі яго дарожныя замалёўкі, якія паяўляліся ў беларускім друку пасля „польскіх“ паездак пісьменніка.

Піліп Пестрак наш добры сябра. Не было выпадку, каб будучы ў Польшчы, ён не знайшоў часу і не заглянуў хоць на дзянёк у Беласток. І думаю, што наша сяброўства мае для пісьменніка і асабістыя прычыны.

У дзяцінстве Піліп Пестрак тры гады пражыў у Мастах. Ён піша: „Цяпер, калі даводзіцца ехаць да Гродна і поезд спыніцца ў Мастах, я заўсёды з акна вагона пільна разглядаю наваколле, каб запрыкмеціць што-небудзь знаёмае“.

Ці гэта матывацыя не падыходзіць і да яго асаблівых адносін да Беластока? Гартаючы літаратурныя старонкі „Вольнай працы“ за веснавыя месяцы 1941 года (выходзіла ў Беластоку), я сустрэў артыкул „У беластоцкім Доме пісьменнікаў“, у якім прачытаў: „Пісьменніцкая арганізацыя горада Беластока жыве паўнакроўным творчым жыццём. Большасць пісьменнікаў імкнецца глыбока азнаёміцца, вывучыць і прачуць сацыялістычную рэчаіснасць, упорна авалодвае савецкай тэматыкай“.

Сярод іх быў і Піліп Пестрак, які ў той час, як паведамляе газета, працаваў над новымі вершамі. У іншым нумары бачым фота пісьменніка за работай над цыклам навел з турэмнага жыцця.

Ці інтэнсіўны беластоцкі перыяд у біяграфіі Піліпа Пестрака не аставіў следу ў яго сэрцы? Ці не па ім заўсёды пісьменнік трапляе да нас?

За гэты трывалы след прымі, добры сябра, і наш паклон у дзень твайго юбілею.

Г. Валкавыцкі

Мала, але цікава

КОЛЬКІ ТЭЛЕВІЗАРАЎ У СССР?

У СССР лік тэлевізараў набліжаецца да 50 мільёнаў. На кожныя 100 сем'яў у гэтай краіне 90 можа глядзець тэлеперадачы.

У Савецкім Саюзе дзейнічае цяпер звыш 1000 перадатачных тэлевізійных станцый. Першае месца займае маскоўскае „Астанкіна“, вышыня якога 533 метры.

Час перадачы каляровых тэлевізійных праграм у Маскве, Ленінградзе, Кіеве, Ташкенце, Тбілісі і Баку ўзрос да 14 гадзін у суткі. (ті)

Кансультацыя юрыста

ПЫТАННЕ: Грамадзянін Х. быў пакараны штрафам за продаж 20 долараў, якія атрымаў у пісьме з Амерыкі. Штраф заплаціў. Аднак фінансавыя ўлады звярнуліся да суда з патрабаваннем засуджэння ад яго 2000 зл., якія ён атрымаў за долары. Ці можна два разы караць за тое самае?

АДКАЗ: Зразумела, два разы караць за той самы ўчынак нельга. Аднак у гэтым выпадку справа ў чымсь іншым. Па закону ўсё тое, што здабыта ў выніку правіннасці, падлягае канфіскацыі на карысць дзяржавы. Продаж долараў прыватным асобам з'яўляецца ўчынкам, які караецца згодна з правам карным скарбовым, а тым самым з'яўляецца правіннасцю і ўсё атрыманае за прададзеныя долары падлягае канфіскацыі. Потым фінансавыя ўлады або пракурор маюць права звярнуцца да суда з патрабаваннем заплаты дзяржаве грошай, атрыманых за долары. Гэта не мае нічога супольнага з карай і незалежна ад кары. Таму, калі б нават кара была даравана, прыкладна, на аснове амністыі, дзяржава можа патрабаваць звароту грошай, атрыманых за продаж долараў.

„БЕЛАРУСКАЯ ПЕСНЯ-73“



Удзельніца фінальнага агляду Аляксандра Лукша з Міхалова.

Фота А. Карпюка.

Куток практычных ведаў



ПЯЦЬ РАЗОЎ ПАТРАВЫ З РЫБЫ

Нядаўна мы заахвочвалі нашых чытачоў да большага выкарыстоўвання марской рыбы. Сёння падаем 5 рэцэптаў на патравы, якія можна рабіць з рыбы не толькі марской, але і салодкаводнай.

РЫБА ТУШАНАЯ Ў ГАРОДНІНЕ

На 1,25 кг рыбы даць 10 дэкаў пятрушкі, 10 дэкаў сэлераў, 10 дэкаў морквы, 10 дэкаў поры, 20 дэкаў цыбулі, 5 дэкаў масла, шклянку вады, соль, перац і 3 дэкі таматнага канцэнтрату. Ачысціць рыбу, нарэзаць яе на порцыі, пасаліць, пасыпаць перцам. Ачысціць і нарэзаць гародніну, палажыць яе ў плоскую каструльку, дадаць масла і ваду, пасаліць, варыць мінут дзесяць. Пасля гэтага на гародніну палажыць кавалкі рыбы і разам тушыць на невялікім агні каля 30 мінут. У канцы дадаць таматны канцэнтрат. Падаючы рыбу, палажыць яе на талерку, абліўшы атрыманым соусам з гароднінай.

РЫБА ЗАПЯКАНАЯ Ў МАЛОЧНЫМ СОУСЕ

На 1,25 кг рыбы ўзяць тры дэкі масла. Соус зрабіць з 4 дэкаў масла, 3 дэкаў мукі, шклянкі малака, паўшклянкі смятаны, 1 жаўтка, соку з палавіны лімона, 4 дэкаў вострага сыра. Ачышчаную рыбу парэзаць на порцыі, пасаліць, палажыць у плоскую каструльку, спырснуць рыбу маслам і ўставіць у духоўку. На соус растапіць масла, змяшаць яго з мукой, развесці малаком і смятанай, закіпяціць. Дадаць лімонны сок, соль, сыры жаўток і частку сцертага сыра. Падпечаную рыбу абліць соусам, пасыпаць рэштай цёртага сыра і запячы.

ВАРАНАЯ РЫБА ПАД ПОЛЬСКІМ СОУСАМ

На 1 кг рыбы ўзяць па пяць дэкаў валашчыны, 15 дэкаў цыбулі, 8 дэкаў масла і два яечкі. Рыбу парэзаць на порцыі, пасаліць, валашчыну нарэзаць, палажыць яе ў каструльку, на гэта рыбу, заліць вадою, варыць мінут трыццаць. Зварыць крутыя яечкі, абабраць іх і пасячы. Масла растапіць, абліць ім звараную рыбу і пасыпаць пасечаным яечкам.

РЫБА ЗАПЯКАНАЯ З ГРУДЗІНКАЙ

Узяць 75 дэкаў рыбнага філе, 10 дэкаў капчонай грудзінкі, 5 дэкаў цыбулі, соль, перац, 3 дэкі масла, зялёную пятрушку. Філе нарэзаць, пасаліць, пасыпаць перцам і памачаць у вельмі дробна нарэзаную цыбулю. Грудзінку нарэзаць на тонкія скрылёчкі, гэтымі скрылёчкамі загарнуць кожны кавалак рыбы, пракалоўшы яе палачкай, палажыць на бляху і запякаць каля паўгадзіны. Падаючы, пасыпаць зялёнай пятрушкай.

РЫБА ТУШАНАЯ З ХРЭННЫМ СОУСАМ

На 75 дэкаў рыбнага філе ўзяць 10 дэкаў хрэну, 3 дэкі мукі, 15 дэкаў смятаны, 4 дэкі тлушчу, соль, цукар, лімонны сок. Кожную порцыю рыбы абсыпаць мукою, падсмажыць. Хрэн абабраць і сцерці на дробнай тарцы. Смятану размяшаць з рэштай мукі, хрэнам і заліць атрыманым соусам рыбу, запраўўшы яго соллю і цукрам па смаку. Тушыць разам з рыбай мінут пяць.

Гаспадыня



— Я шчаслівы, што па меры сіл садзейнічаў выкрыццю і спыненню імперыялістычных агрэсій і дыверсій, што мне ўдалося ўнесці сваю крупінку ў барацьбу народаў за мір, за лепшую будучыню чалавецтва.

Пасля падпісання перамір'я ў Карэі 27 ліпеня 1953 года Блейк разам з некаторымі іншымі замежнымі дыпламатамі, інтэрніраванымі ў час узяцця Сеула часцямі Карэйскай народнай арміі, вярнуўся ў Лондан. Кіраўніцтва англійскай разведкі назначае Блейка на пасаду намесніка начальніка аддзела тэхнічных аперацый СІС.

Мы просім Джорджа растлумачыць, якія мэты ставіліся перад яго аддзелам.

— Гэта служба, — гаворыць Блейк, — займаецца аперацыямі па сакрэтнаму падслухоўванню за рубяжом. У першую чаргу СІС спрабуе арганізаваць падслухоўванне прадстаўніцтва СССР і сацыялістычных краін у розных краінах свету, а таксама прыватных кватэр работнікаў гэтых устаноў. Трэба сказаць, што ініцыятарам найбольш значных аперацый па падслухоўванню з'яўляўся англійскі разведчык, былы рэзідэнт СІС у Вене, а затым у Заходнім Берліне Пітэр Лан. Наогул аперацыі па падслухоўванню праводзяцца СІС у вялікім маштабе, на іх трацяцца велізарныя сродкі, частка гэтых аперацый праводзілася разам з ЦРУ.

У СІС быў таксама невялічкі аддзел пад кодавай назвай „Н“. Ён займаўся тайным распакоўваннем мяшкоў з дыпламатычнай поштай іншых дзяржаў. Спачатку была ідэя ўскласці на гэты аддзел апрацоўку матэрыялаў, атрыманых у выніку правядзення аперацыі па падслухоўванню, але затым вырашылі стварыць самастойны аддзел, які атрымаў кодавую назву „У“, намеснікам начальніка якога я і быў прызначаны. Цяпер па памяці я магу назваць некалькі аперацый па падслухоўванню. З дапамогай аперацыі „Контрары — А“ ажыццяўлялася, напрыклад, падслухоўванне польскага гандлёвага прадстаўніцтва ў Бруселі. Аперацыя „Контрары — С“ азначала ўстаноўку мікрафона ў нумары гасцініцы „Асторыя“ ў Бруселі, які спецыяльна прызначаўся для асоб, што прыязджаюць з сацыялістычных краін. Мікрафон быў умантіраваны таксама ў кватэры гандлёвага аташэ пасольства СССР у Капенгагене. Гэтая аперацыя насіла гучную назву „Фантастык“, відаць, таму, што яе вынікі былі фантастычна нікчэмныя, — з іроніяй дадае Блейк. — Падслухоўваліся размовы ў кватэрах чэшскага прадстаўніка па экспарту шкла ў Каіры, трэцяга сакратара балгарскай місіі ў Лондане...

— Ці можаце вы ў сувязі з гэтым расказаць што-небудзь аб правалах „тэхнічных“ аперацый СІС?

— Па зусім цяпер ужо, спадзяюся, вам зразумелых прычынах многія аперацыі заканчваліся правалам. У прыватнасці, усе пералічаныя вышэй. Найбольш буйнай „тэхнічнай“ аперацыяй, якую доўгі час распрацоўвалі і рыхтавалі разведкі ЗША і Англіі, была вядомая аперацыя з берлінскім тунелем, якая мела кодавую назву „Голд“ („Золата“).

У адзін са снежаньскіх дзён 1953 года ў Лондане адбывалася зусім сакрэтная нарада прадстаўнікоў Цэнтральнага разведвальнага ўпраўлення ЗША і Сікрэт інтэліджэнс сервіс Вялікабрытаніі. Нарада выпрацавала рашэнне аб пракладцы тунеля да ліній сувязі савецкіх войск і ліній сувязі Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

Аперацыю фінансавалі янкі; самае складанае абсталяванне абавязаўся паставіць англійскі бок.

Гэты шпіёнскі лаз афіцыйна быў выяўлены сувязістамі. Групы савецкіх войск у ГДР 22 красавіка 1956 года. Савецкі ўрад накіраваў па афіцыяльных каналах адпаведныя ноты пратэсту, у газеце з'явіліся неабвержныя фотадакументы, артыкулы, якія выкрывалі злачынныя дзеянні дыверсантаў. Непадалёк ад Шэнефельдскай шашы, дзе праходзіць граніца амерыканскага сектара Берліна (раён Альт-Глініке), амерыканскія ваенныя ўлады ўзвялі карпусы станцыі падслухоўвання. Ад іх і быў пракапаны шасцісотметровы тунель, абсталяваны па апошняму слову тэхнікі, для падключэння падслухоўваючай, узмацняльнай і іншай шпіёнскай тэхнікі да тэлефонных кабеляў на тэрыторыі ГДР.

Пасля скандальнага выкрыцця, калі ўсе доказы былі ў наяўнасці і гуляць у хованкі не было патрэбы, высокапастаўленыя дзеячы з ЦРУ спрабавалі заяўляць, што, маўляў, гэта аперацыя з'яўляецца самай паспяховай, „самай“ выніковай за апошнія гады. (Трэба ж было хоць неяк апраўдаць велізарныя выдаткі, звязаныя з пракладкай тунеля!). Але тады яшчэ ні ў Вашынгтоне, ні ў Лондане не маглі нават меркаваць аб галоўным — іх акцыя аказалася асуджанай на правал яшчэ да таго, як былі складзены чарцяжы гэтага „прадпрыемства“.

У якасці намесніка начальніка аддзела „У“ Джордж Блейк прымаў асабісты ўдзел у лонданскай нарадзе спецыялістаў-разведчыкаў СІС і ЦРУ па гэтай аперацыі. Ён уважліва чытаў пратаколы нарады, прымаў меры, каб ні адна дэталь, ні адно ўказанне па гэтай справе з Лондана не былі ўпушчаны.

— Аднак ведаць усё — гэта яшчэ паўсправы. Важна, каб звесткі своечасова былі перададзены ў Маскву, — працягваў Блейк. — Акрамя таго былі і іншыя прычыны, чаму я вырашыў выклікаць свайго калегу, які забяспечваў сувязь з Масквой на экстранную сустрэчу.

(Працяг будзе)

© PDF: Kamunikat.org 2023

ТРЫБУНА чытачоў

*

Выў час,
калі зваліліся на зямлю
чорныя хмары,
як велізарнае стада гракоў.
Быў час
расстрэльвання світаннем
і ў бляску сонца.
Быў час...
Мінула ўсё
і новы час настаў —
празрысты,
светлы,
дарагі.
Жывём сучаснасцю,
напіты ёю досыта.

Яўгень Семянюк,
Бельскі беларускі ліцэй



МОЛАДЗЬ

Хістаюць нас ветры гісторыі,
Калышуць нас хвалі жыцця.
Грэе нас сонца навукі,
Служыць нам мудрасць уся.

Ужо хутка мы шар наш пакінем —
З усмешкай увайдзём на касмадром,
Пінжак мы касмічны накінем,
Да зорак бліскучых рванём.

Шмат новых планет мы пазнаем,
Новым сябрам рукі дамо
Гімн дружбы і шчасця зайграе
Ва ўмелых грудзях маладых.

Юрка Панасюк,
Бельскі беларускі ліцэй

АСФАЛЬТ

Нядаўна на вуліцы ў Дубічах Царкоўных распачаліся работы пры закладцы асфальту. Гатовы асфальт прывозяць грузавікі з Гайнаўкі і машынай заліваюць яго на вуліцы. Таму праца ідзе хутка і неўзабаве ўся вуліца ў Дубічах Царкоўных будзе асфальтаванай.

Ініцыятарам гэтай карыснай работы з'яўляецца праўленне гміны ў Дубічах Царкоўных.

Работы вядзе кіраўніцтва павятовага праўлення мясцовых дарог у Гайнаўцы.

М. Панфілюк

Ён не чытае «СЭРЦАЙКА».

Вы такога глупства не зробіце. Вы сёння адлічыце 28 злотых і 80 грошай і неадкладна зробіце гадавую падпіску.

Паслугі ва ўрочышчы „Жалубок"

У Дубічах Царкоўных ва ўрочышчы „Жалубок", дзе некалькі год таму назад сяляне выкарчавалі хмызнякі і пасеялі высакаякасныя травы, цяпер два разы ў год высейваюцца мінеральныя ўгнаенні, каб быў добры пакос.

Нядаўна пры дапамозе трактараў былі падсеяны фосфар і патас (азот ужо вясною). Гэткая паслуга сялянам вельмі на руку. За работу машынай селянін плаціць толькі 25 працэнтаў, рэшта коштаў ідзе з дзяржаўнага фонду.

М. Панфілюк

Узнагароджаны за заслугі

На апошняй сесіі гмінnай рады ў Шудзялаве гаспадар з вёскі Пшняна Старое Мікалай Белабокі быў узнагароджаны адзнакай „Заслужаны для Беласточчыны". Мікалай Белабокі гаспадарыць на 6 гектарах. Збірае ён з гектара больш 20 цэнтнераў жыта і ячменю. У год прадае 15 свіней. Ён перадавы гаспадар у Шудзялаўскай гміне і за дасягненні на сваёй гаспадарцы атрымаў гэту ўзнагароду.

Другая адзнака „Заслужаны працаўнік сельскай гаспадаркі" была ўручана Зыгмунту Баху з Новага Вострава, таксама за добрыя вынікі ў гаспадарцы. Зыгмунт Бах гаспадарыць на 8 гектарах, гадуе 6 штук быдла, у год прадае 6 тысяч літраў малака. Ён рыхтуе сіласы на пашу для кароў. Дае да 140 кг мінеральных угнаенняў у чыстым складзе на гектар зямлі. Таму і збірае больш 20 цэнтнераў збожжа (жыта, аўса і пшаніцы) з гектара. У год прадае 15—17 кормнікаў. Належыць да перадавых гаспадароў у Шудзялаўскай гміне.


А. С.

Урачыстасць у Баброўніках

У маляўнічай вёсцы Баброўнікі (назва напэўна ад баброў, якія і цяпер, але асабліва даўным-даўно тут вадзіліся), гміны Гарадок, адбылося ўрачыстае святкаванне XXX гадавіны ЛВП. Была акадэмія, спалучаная з сустрэчай з афіцэрамі ЛВП.

Урачыстасць адбылася ў школе. Прысутнічала ўся моладзь і некаторыя са старэйшых жыхароў вёскі. З дакладам на тэму ЛВП выступіла вуч. VIII кл. Лена Казлоўская. А даклад быў апрацаваны пры дапамозе Марыі Кузьміч — настаўніцы беларускай мовы ў класах V—VIII баброўніцкай школы.

Ян Федзюкевіч



Дарагое „Сэрцайка"!

Мне 17 год. Жыву я на вёсцы. Хаджу з хлопцам з нашай вёскі ўжо больш як год. Мішу я кахаю. Ён таксама мяне кахае, гаворыць, што ажэніцца са мной. Але вось пару месяцаў назад я была ў сяброўкі на вяселлі. На вяселлі я пазнаёмілася са Слаўкам. Мы ўвесь час разам сядзелі, а таксама гулялі на забаве. Славак мне вельмі спадабаўся. Хутка пасля таго я атрымала ад яго ліст. Потым да мяне прыехаў. Надалей мы перапісваемся. Міша таксама да мяне прыходзіў, але нядаўна пайшоў ён у войска. Цяпер перапісваюся з абодвума хлопцамі. Яны мне абодва падабаюцца і я іх кахаю. Але Слаўка больш, ён прыгажэйшы ад Мішы. Хлопцы адзін аб другім не ведаюць і абодва абяцаюць са мной жаніцца. Я ўжо сама не ведаю, якога з іх выбраць на мужа. Можа ты, „Сэрцайка", мне параіш? Буду вельмі ўдзячна.

Галіна з Бельшчыны

Галіна! Адно пэўнае: хлопцаў ты не кахаеш, яны толькі табе падабаюцца. Кахаць жа двух адразу немагчыма. Ды ты яшчэ вельмі маладая, каб замуж выходзіць. Не спяшайся. Трактуй хлопцаў, як сяброў. А час пакажа, які з іх бліжэйшы твайму сэрцу будзе. Ведай адно толькі, што змяніць хлопца аднаго на другога — справа простая, а ўжо мужа — намнога больш складаная.

„Сэрцайка"

Аляксандра Бергман — госцем у нашым ліцэі

Дзень 30 кастрычніка г.г. быў урачыстым у Бельскім беларускім ліцэі. Мы ведалі, што да нас прыедзе лектар ЦК ПАРП Аляксандра Бергман. Ведалі мы, што яна навукова займаецца жыццём вялікага сына беларускага народа Браніслава Тарашкевіча. Тарашкевіч — гэта таксама патрон нашай школы, таму менавіта мы так чакалі прыезду дарагога госця. Кожны хацеў даведацца як найбольш аб патроне школы, у якой вучыцца.

Аляксандра Бергман — старэйшы чалавек, вядомы рэвалюцыйны дзеяч. Яшчэ ў міжваенны перыяд была ўдзельнікам рэвалюцыйнага руху. Яна сабрала многа звестак і матэрыялаў аб Б. Тарашкевічу.

Фатакопіі матэрыялаў, сабраных А. Бергман знаходзяцца ў нашым прышкольным музеі-ізбе памяці.

У час сустрэчы з вучнямі Аляксандра Бергман расказала нам аб жыцці і дзейнасці Тарашкевіча і аб сваіх сустрэчах з людзьмі, якія асабіста ведалі гэтага вялікага рэвалюцыянера.

На заканчэнне яна абяцала перадаць нашай школе многа матэрыялаў і арыгінальных дакументаў, звязаных з імем Тарашкевіча, а таксама выказала сваю радасць, што наша школа мае такога слаўнага патрона.

Прадстаўнікі моладзі — вучні чацвёртых класаў Э. Вуж, Т. Філіманюк, Р. Бандарук кветкамі і добрымі словамі падзякавалі Аляксандры Бергман за мілую і карысную сустрэчу.

Яшчэ раз дзякуем праз „Ніву". Жадаем нашай госці многа здароўя і абяцаем, што перададзены нам матэрыял выкарыстаем для глыбейшага азнаямлення з жыццём і дзейнасцю Браніслава Тарашкевіча.

Яўгень Семянюк
Бельскі беларускі ліцэй
кл. IV „а"

Святліца ў рамізе

У вёсцы Маліннікі пабудавалі новую стражацкую рамізу. Пры рамізе, як гэта цяпер усюды на вёсцы практыкуецца, адразу ёсць і святліца для культурнай і мастацкай працы. Новую рамізу-святліцу ўрачыста адкрылі і аддалі ў карыстанне. На гэтую ўрачыстасць з'ехалася многа моладзі з навакольных вёсак. Былі таксама традыцыйныя танцы. Граў 4-асабовы аркестр з Маліннікаў.

Цяпер у Малінніках ёсць куды зайсці ў вольны час вечарамі. У вёсцы працуюць маладзёжныя і грамадскія арганізацыі — яны змогуць унесці ў святліцу цікавыя формы працы. Ад усіх, зрэшты, залежыць, каб малінніцкая святліца стала месцам разумнага адпачынку і цэнтрам культурнай дзейнасці.

Наглядальнік

У АДКАЗ НА НАШУ КРЫТЫКУ

Ці ўсё як трэба ў міхалоўскай малачарні?

Адказвае: Prezydium Powiatowej Rady Narodowej — Wydział Rolnictwa, Leśnictwa i Skupu na miasto i pow. Białystok.

W związku z opublikowanym artykułem w „Niwie" Nr 37 (916) z dnia 16.IX.1973 r. pt. „O michałowskiej mleczarni i o śmierdzącym powietrzu", Prezydium Powiatowej Rady Narodowej — Wydział Rolnictwa, Leśnictwa i Skupu w Białymstoku przy udziale przedstawicieli: BSM w Białymstoku, Urzędu Gminy w Michałowie w osobach sekretarza KG PZPR i Sekretarza Urzędu Gminy oraz kierowniczki mleczarni, przeprowadził w dniu 19.X.1973 r. dochodzenie w przedmiotowej sprawie. W związku z powyższym wyjaśnia się co następuje:

— Podczas przeprowadzania wizji lokalnej obiektu, oraz odprowadzalnika ścieków tj. rowu melioracyjnego i rzeki Supraśl stwierdzono, że ścieki wypływające z mleczarni, w/g oświadczenia przedstawiciela Laboratorium Badania Wód i Ścieków PWRN w Białymstoku, nie posiadają w swym składzie serwatki. Powyższe udokumentowane jest również w wykonanych przez te laboratorium analizach ścieków, Nr. analizy GWL 510/688/73 z dnia 29.VI.73 r.

— W dniu kontroli stwierdzono komisyjnie, że wypływające z mleczarni ścieki posiadają jedynie kolor jasnoszary, który jest spowodowany płukaniem konew, posadzki oraz innych urządzeń w zakładzie.

— W miesiącach letnich, w których występował nadmiar serwatki po uprzednim zaopatrzeniu rolników, możliwość wywożenia serwatki mogła mieć miejsce.

— W/g oświadczenia kierowniczki zakładu Ob. Jolanty Guziejko serwatka wówczas była wywożona do wysypiska w miejscowości Rohental k/Michałowa, które to miejsce zostało wskazane przez Urząd Gminy w Michałowie, pismo Nr. 402/36/73 z dnia 29.V.1973 r.

— O ile chodzi o odpłatność za serwatkę, sprawa przedstawia się następująco: dostawcy mleka do miejscowej spółdzielni z rejonu Michałowa otrzymują serwatkę odpłatnie, natomiast dostawcy z oddalonych miejscowości otrzymują serwatkę nieodpłatnie, na podstawie uchwały zarzadu. W trakcie przeprowadzonej rozmowy sołtys wsi Pieńki Ob. Greś Aleksander stwierdził, że „przez cały okres czasu otrzymywał dostateczną ilość serwatki". Sytuacja, o której jest mowa w artykule zaistniała wówczas, gdy była mała produkcja i dostawa mleka do mleczarni, niemniej jednak przez cały czas serwatkę otrzymywałem i otrzymuję".

W związku z zaistniałą sytuacją Wydział Rolnictwa, Leśnictwa i Skupu PPRN w Białymstoku wydał polecenie wzmożenia kontroli przez służbę rolną w Michałowie nad prawidłowym gospodarowaniem serwatką i jednocześnie zalecono BSM w Białymstoku wzmożoną kontrolę i nadzór w zakresie prawidłowego zagospodarowania tak cennej paszy dla zwierząt inwentarskich.

Podpisał:
Kierownik Wydziału Rolnictwa, Leśnictwa i Skupu
mgr inż. Jerzy Bonarski

Do wiadomości:
1. **Urząd Gminy w Michałowie**
2. **B-stocka Spółdzielnia Mleczarska w Białymstoku ul. Zwycięstwa.**

КІНО

ГАЙНАЎСКІ ПАВЕТ

Белавежа
„Z księgi króla" (radz.), 27—28.XI. „Jeźdźcy" (USA), 29—30.XI.

Чаромуха
„Porachunek" (angl.), 27—28.XI.

Кляшчэлі
„Ponieważ się kochają" (rumuński), 27—28 „Na rabunek" (radz.), 29—30.XI. „Obstrzał" (USA), 1—2.XII.

Нараўка
„Zaproszona" (franc.), „Ślub bez obrączki" (czeski), 28.XI—2.XII.

Нарва
„Nie lubię poniedziałku" (polski), 28.XI.—2.XII.

Чыжы
„Niech bestia zdycha" (franc.), „Wiryneja" (radz.), 28.XI—2.XII.

Дубічы Царкоўныя
„Wakacje we czworo" (włoski), „Wrzesień 1939" (polski), 28.XI.—2.XII.

Арэшкава
„Wakacje we czworo" (włoski), 1—2.XII.

БЕЛЬСКІ ПАВЕТ

Орля
„Morderca samotnych kobiet" (NRD), „Tylko wtedy, gdy się śmieję" (angl.), 28.XI—2.XII.

Райск
„Grubasek" (angl.), „Poszukiwana — poszukiwany" (polski), 28.XI—2.XII.

БЕЛАСТОЦКІ ПАВЕТ

Міхалова
„Lampy naftowe" (CSRS), 27—28.XI. „Bunt na Bounty" (USA), 29—30.XI.

САКОЛЬСКІ ПАВЕТ

Шудзялава
„Mordercy w imieniu prawa" (franc.), „Szatnia pełna królików" (węgierski), 28.XI—2.XII.

СЯМЯЦІЦКІ ПАВЕТ

Нурэц
„Fraulein doktor" (jugosł.), 27—28.XI. „Śledztwo skończone proszę zapomnieć" (włoski), 29—30.XI. „Abel twój brat" (polski), 1—2.XII.

Мілейчыцы
„Zbyszek" (polski), 27—28. „Życie, miłość i śmierć" (franc.), 29—30.XI. „Dramat zazdrości" (włoski), 1—2.XII.

Ніва

Organ Zarządu Głównego Białoruskiego Towarzystwa Społeczno-Kulturalnego. Wydawca: Białostockie Wydawnictwo Prasowe RSW „Prasa-Książka-Ruch". Redaguje Kolegium. Adres Redakcji: Białystok, ul. Wesołowskiego 1. Numer przy przesyłkach pocztowych: Redakcja tygodnika „Niwa", Skr. poczt. 281, 15-950 Białystok. Telefony: Redaktor Naczelny i Sekretarz Redakcji 2-10-33, publicysci 2-32-41 do 45 (centrala). Cena prenumeraty krajowej: rocznie: 28,80 zł, półrocznie: 14,40 zł. kwartalnie: 7,20 zł. Prenumeraty przyjmowane są do dnia 10 każdego miesiąca poprzedzającego okres prenumeraty. Prenumeraty na kraj dla czytelników indywidualnych przyjmują Urzędy Pocztowe oraz listonosze. Można również wpłaty dokonywać na konto I Oddziału Rejonowego „Ruch" w Białymstoku 150-6-161 NBP I OM Białystok. Na odwrocie blankietu należy podać okres prenumeraty i tytuł zamawianego pisma. Wszystkie instytucje państwowe i społeczne w miastach, zamawiają prenumeratę wyłącznie za pośrednictwem Oddziałów i Delegatur RSW „Prasa-Książka-Ruch". Pozostałe — mające siedzibę na wsi lub w innych miejscowościach, w których nie ma Oddziałów i Delegatur zamawiają prenumeratę za pośrednictwem Urzędów Pocztowych. Prenumeratę na zagranicę przyjmuje: RSW „Prasa-Książka-Ruch", Biuro Kolportażu Wydawnictw Zagranicznych, Wronia 23, 00-840 Warszawa. Konto PKO Nr 1-6-100024. Cena prenumeraty dla zagranicy jest wyższa od prenumeraty krajowej o 40 proc. Nr indeksu 36911.

BZGraf. **Nakład 7.669** K-3

Давярайце — правярайце

Я ўвайшоў у магазін самаабслугоўвання. І праз хвіліну накіраваўся да выхаду. Направа ад дзвярэй за касавым апаратам сядзела поўненькая румяненькая жанчынка.

— У вас што? — яна ўзняла на мяне вялікія блакітныя вочы.

Расшпіліўшы партфель, я пачаў моўчкі выкладаць перад ёю сшыткі, кніжкі, загорнуты ва ўчарашнюю газету пакунак (жонка паклапацілася пра мой абед) і нават некалькі каштанаў, падабраных на вуліцы.

— Бачыце? Тут нічога няма, — я працягнуў ёй парожні партфель. — Можаце нават памацаць.

— Навошта? — чырванеючы па самыя вушы, спытала яна. — Мы вам верым.

— Э-э, — сказаў я, — давяраць, вядома, трэба, але і правяраць таксама. Самі ведаеце, які цяпер народ пайшоў, свісне і не папросіць прабачэння.

Тым часам я, не спяшаючыся, злажыў рэчы ў партфель, пасля чаго зашпіліў яго і паставіў на падлогу.

— Цяпер праверым кішэні, — рашуча заявіў я і пачаў выцягваць хустачкі і аўтаручкі, дакументы і адарваныя гузікі. Урэшце, перапоўнены пачуццём уласнай годнасці, вывернуў кішэні.

— І тут нічога!

Потым зняў пінжак.

— Канстатуем: і пад пінжаком нічога не выяўлена.

Я ўзяўся за рэмень, расшпіліў спражку. І раптам пачуў роспачны крык: блакітныя вочы касіркі закаціліся за цёмнасінія хмаркі век...

— Што з вамі? — спытаўся я.

— Вады, — ледзь чутна прашаптала яна.

Я схапіў з паліцы пляшку ліманаду, збіў аб вугал стала металічную затычку...

Калі я выйшаў з магазіна, на сэрцы было лёгка і радасна.

Памацаў заднюю кішэню і задаволена ўсміхнуўся — чвэртка „Выбаровай" была на месцы.

Е. Камінскі

Прычоска а-ля Сатурн.

ЦІ ЧУЛА

Маладая дзяўчына ў міні-спадніцы бойка спявае лёгкадумныя песні. Стары свяшчэннік глядзіць на яе і цяжка ўздыхае.

— Вы чулі калі-небудзь дзесятую запаведзь, дзіцё маё? — засмучана пытае ён дзяўчыну.

— А вы, святы айцец, насвішчыце з яе некалькі тактаў — магчыма, і чула!

НІЎКА

— Разбэсціў гэтага пса...

ДАПАМАГАЎ

— Табе дапамагаў бацька вучыць урокі? — спыталі ў Міколкі.

— А то як жа! — адказаў той. — Я пісаў, а ён стаяў каля мяне з папружкаю.

У РЭСТАРАНЕ

— Афіцыянт, магу я заказаць паўпорцыі біфштэксу?

— На жаль, не. Нашы порцыі падзяліць немагчыма...

Пункт гледжання падхаліма

Сваё начальства я шаную
І цвёрда ведаю адно:
Яно не п'е, а дэгустуе,
Не есць — харчуецца яно.
Калі ж працоўным днём, бывае,
Начальства сон той падкасіў —
Яно не спіць — адпачывае,
Каб назапасіць творчых сіл.
Здарэцца, што слоў тых важкіх
Начальства сыпане затак
Яно не лаецца, заўважце,
Яно выхоўвае вось так.
Бывае, праўда, замятае,
Нібы ліса, свае сляды...
І ўсё ж яно не злоўжывае,
А памыляецца тады.
Калі пайшла ўжо гаворка,
Дык я скажу вось так між нас:
Яно затрымліваецца толькі
І не спазняецца ні раз.

Уладзімір Правасуд

ПРЫЧЫНА

— Чым гэта вы так расхваляваны сёння?

— Пазнаніў муж маёй былой жонкі і аблаяў мяне за тое, што яна не ўмее гатаваць...

МІНІБАЙКІ

РЭПКА
(Казка, вядома)

(Пасадзіў Дзедкін рэпку. І цягне адзін. Цягне-пацягне, а выцягнуць не можа.

Добра, што знайшліся памочнікі. Бабкін схапіўся за Дзедкіна, Унучкін за Бабкіна, Жучкін за Унучкіна, Кошкін за Жучкіна, Мышкін за Кошкіна. Выцягнулі рэпку. Выцягнулі і гавораць:

— Ты не супраць, Дзедкін, каб прэмію атрымліваць у адваротным парадку?

А Дзедкін быў вучоны чалавек.

— Добра, — гаворыць, — ад перамены месц складаемых сума не мяняецца.

І пачалі атрымліваць яны прэміі.

Мышкін атрымаў за Кошкіна, Кошкін атрымаў за Жучкіна, Жучкін за Унучкіна, Унучкін за Бабкіна, а Бабкін... за Дзедкіна.

М. Азаў, У Ціхвінскі

...Мемуары ананімшчыка: «Урыўкі з непадпісанага».

...Баязлівец: памёр на шыбеніцы сваёй смерцю.

ПЕСНІ ПА ЗАЯЎКАХ

Па просьбе Анатоля Плевы з Гайнаўкі і Яна Авечка з Баброўнік змяшчаем песню

Słowa: Agnieszka Osiecka
Muzyka: Jan Ptaszyn-Wróblewski

Przygoda z Marią

Przygoda z Marią,
krótkich parę dni,
przygoda z Marią
wraca w moje sny.
Obrączki miała Maria dwie,
a może trzy...
Kolorowe włosy miała
i pachniała miętą,
nieraz przedtem już kochała,
powtarzała często.

Przygoda z Marią
jak to dawno już...
Rozstanie z Marią,
letnich ulic kurz.
Ręce w kieszeniach miałem, gdy
w tłumie hen, zniknęłaś mi
i już nie chciałem, by
znów zawróciła z drogi swej
do mych drzwi.

Maria zawsze rację miała
i pachniała miętą,
czegoś się po nocach bała —
powtarzała często.
Nie pokochałem jej,
a dziś w godzinie złej,
O Mario, Mario, Mario...

Kolorowe włosy miałaś,
co dzień było święto,
pachniałaś miętą albo bzem,
O Mario, Mario, Mario...
Nieraz przedtem już kochałaś
i płakałaś często,
pachniałaś miętą albo bzem,
o Mario, Mario, Mario...

Kolorowe włosy miałaś,
co dzień było święto,
płakałaś miętą albo bzem,
o Mario, Mario, Mario...
Nieraz przedtem już płakałaś,
bo kochałaś często,
płakałaś miętą albo bzem,
o Mario, Mario, Mario...

НОВЫЯ ПАТЭНТЫ

Тапор для дваіх.

ХІПІ

Размова сярод хіпі:

— У цябе ніколі не ўзнікае жаданне ўзяць мыла і як след памыцца?

— Позна, стары, усе засцёжкі на маім камбінезоне заржавелі так, што іх ужо не адкрыць...

ЧАЦВЁРТЫ

Амерыканка захацела пяты раз уступіць у шлюб, але спачатку вырашыла пракансультавацца ва ўрача. Урач, натуральна, пацікавіўся, пры якіх акалічнасцях памерлі яе мужы.

— Першыя тры памерлі, атруціўшыся грыбамі.

— А чацвёрты?

— Ад зрушэння мазгоў.

— Так, так...

— Разумееце, ён не любіў грыбоў...

— На што скардзіцеся?

ГАСПАДАР

Мела жонка мужа п'яніцу. Дзе не схавае грошы, а ён знойдзе і прап'е. Думала жонка, думала, ды й схавала грошы ў венік. Калі аднойчы яна да веніка, а там іх і следу няма.

— Трахім, ты грошы з веніка ўзяў?

— Узяў і ўжо прапіў.

— Мне не шкада, што ты іх прапіў, што ж зробіш з такім п'яніцам!.. Але скажы, як ты іх там знайшоў.

— А што б я быў за гаспадар, калі б не ведаў, дзе ў мяне што ў хаце ляжыць, — адказаў муж.

ПАМЫЛІЎСЯ

Зайшоў у майстэрню да жывапісца прыяцель ды й пачаў яго выхваляць:

— Твая апошняя карціна, дружа, выдатная! Краявід беззаганны, возера цудоўнае. Адзінае, над чым раю яшчэ папрацаваць, гэта свінні. Яны больш падобны на гусей.

— Якія свінні? — абразіўся мастак, — гэта ж козы.

— Сапраўды? — перапытаў прыяцель. — Тады прашу прабачэння.

ГУМАР З ...

НЕ ТРАПІЎ

Ідзе адзін падарожны чалавек цераз вёску ды й пытае сустрэчнага:

— А скажыце, чалавеча добры, як мне тут цераз рэчку пераабрацца?

— А той яму:

— Я вам зусім не добры чалавек, а стараста тутэйшы.

НЯВЕСТКА ВІНАВАТА

— Хто вінаваты?
— Нявестка.
— Дык яе ж дома няма!
— Ды вось яе плахта вісіць.

Гэта чулае мастацтва...

КУРЪЁЗЫ

СПОСАБ НА ГАНГСТЭРА

Адзін малады амерыканскі гангстэр тэрарызаваў пісталетам касіршу банка і, украўшы 19 тысяч долараў, знік, пакуль з'явілася паліцыя. Сведкам нападзення была адна добра скрытая фотакамера. Дзякуючы ёй дырэкцыя банка магла ўручыць паліцыі вельмі выразны здымак праступніка, і неўзабаве злодзей быў злоўлены.

ПАПЯЛЬНІЧКА ДЛЯ „НЕПІСЬМЕННЫХ"

Барацьба з курэннем мае цэлую гаму адценняў — ад катэгарычнай забароны да ўгавораў і ўздзеяння на пачуццё гумару. Так, у прыёмнай аднаго з міністэрстваў у Стакгольме вывешана таблічка з забаронай курыць. А пад ёю на століку стаяць... дзве папяльнічкі з надпісам: „Для тых, хто не ўмее чытаць".

МЫШЫ І АЎТАМАБІЛІ

На гандлёвых вуліцах, размешчаных у цэнтры італьянскага горада Мілана, забаронен аўтамабільны рух. Цяпер яны прызначаны толькі для пешаходаў. Уладальнікі універсальных магазінаў, шматлікіх крам, рэстаранаў і бараў спачатку сустрэлі гэта рашэнне з энтузіязмам. Хутка, аднак, аказалася, што гандлёвы цэнтр пачаў цярпець бедства ад мышэй. Напэўна, грызунам таксама былі не па душы аўтамабілі з іх выхлапнымі газамі і шумам. Як толькі машыны зніклі з вуліц, мышы адразу ж пачалі масавае перасяленне ў цэнтр горада.

Цяпер тыя ж самыя гандляры энергічна пратэстуюць супраць новаўвядзення, спачатку наведвальнікі пачалі больш ахвотна наведваць іх магазіны, а цяпер мышы адпудзілі многіх з іх.

Міжы намі

Каб праверыць сябра, трэба пабыць яго падначаленым.